ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і мастацтва

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

№ 95 (1732) | Аўторак, 27 лістапада 1962 года | Цана 4 кап.

ІНФАРМАЦЫЙНЫЯ ПАВЕДАМЛЕННІ

АБ ПЛЕНУМЕ ЦЭНТРАЛЬНАГА КАМІТЭТА КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ САВЕЦКАГА САЮЗА

23 лістапада 1962 года на Пленуме Цэнтральнага Камітэта КПСС працягвалася абмеркаванне даклада таварыша М. С. Хрушчова «Развіццё эканомікі СССР і партыйнае кіраўніцтва народнай гаспадаркай».

На ранішнім пасяджэнні выступілі таварышы: Т. І. Сакалоў (першы сакратар Цаліннага крайкома КП Казахстана), В. Э. Дымшыц (намеснік Старшыні Савета Міністраў СССР, Старшыня Дзяржплана СССР), К. К. Нікалаеў (першы сакратар Свярдлоўскага абкома КПСС), В. Н. Кулікоў (дырэктар саўгаса «Пахта-Арал», Казахская ССР), П. Е. Саблеў (дырэктар Харкаўскага трактарнага завода імя Арджанікідзе).

На гэтым абмеркаванне даклада таварыша М. С. Хрушчова заканчваецца.

З заключным словам на Пленуме ЦК КПСС выступіў Першы сакратар ЦК КПСС, Старшыня Савета Міністраў СССР таварыш М. С. Хрушчоў.

Пленум ЦК КПСС аднагалосна прыняў пастанову па дакладу таварыша М. С. Хрушчова «Развіццё эканомікі СССР і партыйнае кіраўніцтва народнай гаспадаркай».

На вячэрнім пасяджэнні Пленум ЦК КПСС разгледзеў арганізацыйныя пытанні.

Пленум выбраў тав. Яфрэмава Л. Н. кандыдатам у члены Прэзідыума ЦК КПСС. Пленум перавёў з кандыдатаў у члены ЦК КПСС таварышаў Палякова В. І. і Рудакова А. П.

Пленум ЦК КПСС выбраў:

— Сакратаром ЦК КПСС тав. Рудакова А. П.— старшыню Бюро ЦК КПСС па прамысловасці і будаўніцтву;

— Сакратаром ЦК КПСС тав. Палякова В. І.— старшыню Бюро ЦК КПСС па сельскай гаспадарцы;

— Сакратаром ЦК КПСС тав. Андропава Ю. В.;

— Сакратаром ЦК КПСС тав. Цітова В. Н.— старшыню Камісіі па арганізацыйна-партыйных пытаннях пры ЦК КПСС.

Сакратар ЦК КПСС тав. Дзёмічаў П. Н. зацверджан старшынёй Бюро ЦК КПСС па хімічнай і лёгкай прамысловасці.

Сакратар ЦК КПСС тав. Ільічоў Л. Ф. зацверджан старшынёй Ідэалагічнай камісіі пры ЦК КПСС.

Сакратар ЦК КПСС тав. Шалепін А. М. зацверджан старшынёй Камітэта партыйна-дзяржаўнага кантролю ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР.

У сувязі з утварэннем Камітэта партыйна-дзяржаўнага кантролю Пленум ЦК вырашыў пераўтварыць Камітэт партыйнага кантролю пры ЦК КПСС у Партыйную камісію пры ЦК КПСС.

Старшынёй Партыйнай камісіі зацверджан тав. Швернік М. М., першым намеснікам старшыні — тав. Сярдзюк З. Ц.

Пленум ЦК КПСС закончыў сваю работу.

АБ РАЗВІЦЦІ ЭКАНОМІКІ СССР І ПЕРАБУДОВЕ ПАРТЫЙНАГА КІРАЎНІЦТВА НАРОДНАЙ ГАСПАДАРКАЙ

Пастанова Пленума ЦК КПСС па дакладу таварыша М. С. ХРУШЧОВА, прынятая 23 лістапада 1962 года

Пленум Цэнтральнага Камітэта КПСС адзначае, што за год, які мінуў пасля XXII з'езда КПСС, наша краіна дасягнула вялікіх поспехаў як ва ўнутраным жыцці, так і на міжнароднай арэне. Рашэнні з'езда, новая Праграма партыі з'явіліся магутным пескаральнікам грамадскага развіцця, актывізавалі барацьбу працоўных мас за мір, дэмакратыю і сацыялізм.

Гістарычныя рашэнні XXII з'езда КПСС выклікалі новы ўздым творчай актыўнасці савецкага народа. Ажыццяўляючы гэтыя рашэнні, партыя дабілася далейшага павышэння авангардной ролі камуністаў, расшырыла і ўмацавала сувязі з працоўнымі, узбагацілася новым вопытам палітычнага кіраўніцтва масамі.

Рабочыя, калгаснікі, савецкая інтэлігенцыя сваёй працай памнажаюць багацці нашай Радзімы, умацоўваюць яе эканамічную магутнасць і абароназдольнасць, актыўна змагаюцца за выкананне сямігадовага плана.

Прамысловасць Савецкага Саюза па выпуску валавой прадукцыі выканала план чатырох гадоў сямігодкі на 104,5 працэнта. Прырост прадукцыі прамысловасці за 1959—1962 гады складзе 45 працэнтаў замест 39 працэнтаў па кантрольных лічбах. Звыш задання будзе выпушчана прамысловай прадукцыі на 28 мільярдаў рублёў.

Шырока разгарнулася капітальнае будаўніцтва. Агульны аб'ём дзяржаўных капітальных укладанняў за 1959—1962 гады дасягне 107 мільярдаў рублёў і будзе амаль на шэсць мільярдаў рублёў больш, чым прадугледжвалася па сямігадоваму плану на гэтыя гады.

За апошнія гады ажыццёўлены буйныя меры па далейшаму ўздыму сельскагаспадарчай вытворчасці. Нягледзячы на неспрыяльныя кліматычныя ўмовы ў радзе раёнаў краіны, у 1962 годзе атрымана збожжа дзевяць мільярдаў пудоў. Нарыхтоўкі збожжа перавышаюць 3,4 мільярда пудоў, або на 270 мільёнаў пудоў больш, чым у мінулым годзе.

Партыя, як і раней, удзяляла вялікую ўвагу ўздыму дабрабыту працоўных. Павялічыўся выпуск тавараў народнага ўжытку, перавыкананы план тавараабароту. У вялікіх маштабах вядзецца жыллёвае будаўніцтва. За чатыры гады сямігодкі ў гарадах і рабочых пасёлках уведзена ў дзеянне жылых домоў агульнай плошчай 325 мільёнаў квадратных метраў, або 8,8 мільёна новых кватэр, у сельскай мясцовасці пабудавана 2 мільёны 400 тысяч жылых домоў.

За апошні перыяд, асабліва пасля XX з'езда КПСС, партыя правяла вялікую работу па ліквідацыі недахопаў ў кіраўніцтве эканомікай і ўдасканаленню кіравання народнай гаспадаркай на аснове ленінскіх прынцыпаў.

Жыццё поўнасцю пацвердзіла правільнасць ленінскага курсу партыі, яе Цэнтральнага Камітэта. Саветы народнай гаспадаркі, калгасна-саўгасныя вытворчыя ўпраўленні — гэта такія формы гаспадарчага кіраўніцтва, якія адпавядаюць сучаснаму ўзроўню сацыялістычнай эканомікі.

Прынятыя партыяй меры па паляпшэнню кіраўніцтва народнай гаспадаркай робяць станоўчы ўплыў на паспяховае выкананне сямігадовага плана.

XXII з'езд КПСС выставіў у якасці адной з першачарговых і важнейшых задач партыі далейшае паляпшэнне кіраўніцтва народнай гаспадаркай. Цяпер неабходна прывесці ў адпаведнасць з патрабаваннямі часу таксама і партыйнае кіраўніцтва прамысловасцю, будаўніцтвам і сельскай гаспадаркай. Ва ўмовах разгорнутага камуністычнага будаўніцтва, калі роля партыі нязмерна ўзрастае, арганізацыйная перабудова кіраўніцтва народнай гаспадаркай мае вялікае палітычнае значэнне.

У наш час ад партыі патрабуецца не толькі ўменне своечасова даць правільны лозунг, але і з веданнем справы штодзённа і канкрэтна кіраваць вытворчасцю: развіццём прамысловасці, сельскай гаспадаркай, усіх галін эканомікі.

Тэмпы развіцця народнай гаспадаркі краіны залежаць галоўным чынам ад працоўных намаганняў мільёнаў, ад умення арганізаваць ажыццяўленне палітыкі партыі, планаў гаспадарчага будаўніцтва.

Аднак арганізацыйныя формы кіраўніцтва народнай гаспадаркай, якія раней склаліся і ў свой час адыгралі станоўчую ролю, не дазваляюць цяпер больш планамерна і канкрэтна займацца ўсімі галінамі прамысловасці і сельскай гаспадаркі, своечасова прымаць эфектыўныя меры па ліквідацыі наяўных недахопаў, параджаюць дэкларатыўнасць і кампанейшчыну ў кіраўніцтве гаспадаркай, перашкаджаюць правільнай расстаноўцы партыйных кадраў, лепшаму выкарыстанню іх ведаў і вопыту.

Каб пераадолець памянёныя недахопы і палепшыць кіраўніцтва народнай гаспадаркай, **неабходна перайсці да вытворчага прынцыпу пабудовы кіруючых органаў партыі знізу даверху.**

Пабудова партыйных органаў па вытворчаму прынцыпу дасць магчымасць забяспечыць больш канкрэтнае і планамернае кіраўніцтва прамысловасцю, будаўніцтвам і сельскай гаспадаркай, сканцэнтраваць галоўную ўвагу на вытворчых пытаннях. Такая перабудова дапаможа актывізаваць усе бакі дзейнасці партыі, яшчэ цясней звяжа арганізацыйную і ідэалагічную работу з задачамі стварэння матэрыяльна-тэхнічнай базы камунізма і выхавання новага чалавека.

Стварэнне матэрыяльна-тэхнічнай базы камунізма патрабуе паскарэння тэмпаў тэхнічнага прагрэсу. У цяперашні час кіраўніцтва большай часткай навукова-даследчых і праектна-канструктарскіх арганізацый расканцэнтравана па саўнаргасах, міністэрствах і ведамствах, што ўскладняе правядзенне адзінай тэхнічнай палітыкі ў галіках народнай гаспадаркі, тармозіць укараненне новай тэхнікі.

Пленум ЦК КПСС лічыць неабходным перабудаваць кіраўніцтва навукова-даследчымі і канструктарскімі арганізацыямі, ліквідаваць паралелізм і раз'яднанасць у іх дзейнасці, ажыццявіць меры па цэнтралізацыі кіраўніцтва тэхнічнай палітыкай.

Пленум ЦК КПСС звяртае ўвагу партыйных, савецкіх і гаспадарчых органаў на істотныя недахопы ў арганізацыі прамысловага, жыллёвага і культурна-бытавога будаўніцтва. Некаторыя саўнаргасы, дзяржпланы саюзных рэспублік, мясцовыя партыйныя органы часта пачынаюць будаўніцтва новых аб'ектаў, не ўзгадняючы з агульнадзяржаўнымі інтарэсамі, без уліку магчымасці забеспячэння іх праектамі, матэрыяламі, рабочай сілай, абсталяваннем, распыляюць сродкі па шматлікіх будоўлях.

У праектаванні і будаўніцтве дапускаюцца празмернасці, вельмі марудна ўкараняюцца сучасныя тыпавыя праекты. Дзейнасць будаўнічых праектных арганізацый па-сапраўднаму не накіроўваецца і не каардынуецца. Многія праектныя інстытуты працуюць замкнёна, дрэнна звязаны з іншымі праектнымі арганізацыямі і навукова-даследчымі інстытутамі. Дзяржбуд СССР не займае вядучага становішча ў арганізацыі будаўнічага праектавання.

Для ліквідацыі гэтых буйных недахопаў неабходна ўпарадкаваць праектаванне будаўніцтва, палепшыць кіраўніцтва справай капітальнага будаўніцтва з боку партыйных арганізацый.

Пяцігадовы вопыт дзейнасці саветаў народнай гаспадаркі паказаў, што буйныя саўнаргасы больш кваліфікавана кіруюць галінамі прамысловасці, маюць большыя магчымасці для манеўравання матэрыяльна-тэхнічнымі рэсурсамі, маюць лепшыя ўмовы для канцэнтрацыі, спецыялізацыі і каапераванага вытворчасці. Цяпер трэба зрабіць новы крок ва ўзбуйненні саўнаргасаў, каб яшчэ паўней выкарыстоўваць магчымасці і перавагі сацыялістычнага ладу.

Расшырэнне маштабаў народнай гаспадаркі, хуткі прагрэс навукі і тэхнікі патрабуюць яшчэ большага павышэння навуковага ўзроўню планавання. Аднак работа Дзяржплана, Дзяржэканамсавета і іншых планавых органаў у многім не адпавядае патрабаванням сучаснага этапу развіцця эканомікі нашай краіны. Гаспадарчыя планы не заўсёды грунтуюцца на старанных эканамічных разліках і даследаваннях, тэмпы развіцця асобных галін і эканамічных раёнаў вызначаюцца па прапорцыях, якія склаліся, не ўлічваецца неабходнасць паскоранага росту найбольш перспектыўных галін прамысловасці, такіх, напрыклад, як хімія, электроніка.

У адпаведнасці з патрабаваннямі Праграмы КПСС неабходна палепшыць справу планавання народнай гаспадаркі, завяршыць пачатую раней перабудову работы планавых органаў.

Пленум ЦК КПСС звяртае ўвагу ўсіх партыйных арганізацый, дзяржаўных, гаспадарчых органаў, прафсаюзаў, камсамола і іншых грамадскіх арганізацый на неабходнасць далейшага развіцця дэмакратычных прынцыпаў удзелу працоўных у кіраванні вытворчасцю, правільнага спалучэння адзіначалля з шырокім прыцягненнем мас да кіравання прадпрыемствамі і будоўлямі.

У перыяд разгорнутага будаўніцтва камуністычнага грамадства нязмерна ўзрастаюць роля і значэнне партыйнага, дзяржаўнага і грамадскага кантролю. Прынятыя партыяй за апошнія гады меры па ліквідацыі вынікаў культу асобы далі магчымасць крыху палепшыць работу кантрольных органаў. Аднак арганізацыйная структура партыйнага і дзяржаўнага кантролю ў яе ленінскім разуменні яшчэ не поўнасцю адноўлена.

Буйныя недахопы ў арганізацыі кантролю сур'ёзна адбіваюцца на ходзе нашага гаспадарчага і культурнага будаўніцтва. Органы дзяржаўнага кантролю яшчэ слаба правяраюць выкананне важнейшых дырэктыў партыі і ўрада, дрэнна вядуць барацьбу з ашуканствам, раскраданнямі, хабарніцтвам, бюракратызмам, цяганінай і іншымі адмоўнымі з'явамі, чужымі прыродзе сацыялістычнага ладу.

Пленум ЦК КПСС лічыць, што ажыццяўленне новых мер па паляпшэнню партыйнага кіраўніцтва народнай гаспадаркай, удасканаленню гаспадарчага кіравання ў прамысловасці і будаўніцтве, стварэнню адзінага партыйна-дзяржаўнага кантролю ў краіне адыграе важную ролю ва ўздыме народнай гаспадаркі, у вырашэнні галоўнай задачы партыі — далейшым паляпшэнні народнага дабрабыту, задавальненні матэрыяльных і духоўных патрэбнасцей працоўных Савецкага Саюза.

Зыходзячы з агульнай лініі партыі на скарачэнне апарату кіравання, паляпшэнне яго дзейнасці, Пленум ЦК КПСС падкрэслівае, што ажыццяўленне карэннай перабудовы работы партыйных, савецкіх, гаспадарчых органаў не толькі не павялічыць колькасць работнікаў апарату, але, наадварот, прывядзе да яго змяншэння і скарачэння расходаў на ўтрыманне апарату.

Савецкі народ, якому выпаў гонар першым пракладваць шлях да камунізма, набыў вялікі вопыт кіравання гаспадаркай. Ажыццяўляючы перабудову кіраўніцтва народнай гаспадаркай, Камуністычная партыя зыходзіць з ленінскіх указанняў аб неабходнасці пастаянна ўдасканальваць формы арганізацыі новага грамадства і кіравання сацыялістычнай эканомікай.

Пленум Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі Савецкага Саюза **пастанаўляе:**

I.

У галіне партыйнага кіраўніцтва народнай гаспадаркай:

1. Адобрыць распрацаваныя Прэзідыумам ЦК КПСС і выкладзеныя ў дакладзе таварыша М. С. Хрушчова на гэтым Пленуме ЦК мерапрыемствы па перабудове партыйнага кіраўніцтва народнай гаспадаркай.

2. Прызнаць неабходным рэарганізаваць кіруючыя органы партыі знізу даверху, паклаўшы ў аснову вытворчы прынцып, і такім шляхам забяспечыць больш канкрэтнае кіраўніцтва прамысловай і сельскагаспадарчай вытворчасцю.

Утварыць у межах цяпер існуючага краю, вобласці, як правіла, дзве самастойныя партыйныя арганізацыі:

— краявую, абласную партыйную арганізацыю, якая аб'ядноўвае камуністаў, што працуюць у прамысловасці, будаўніцтве, на транспарце, у навучальных установах і навукова-даследчых інстытутах, праектных, канструктарскіх арганізацыях і іншых установах, абслугоўваючых прамысловую вытворчасць і будаўніцтва;

— краявую, абласную партыйную арганізацыю, якая аб'ядноўвае камуністаў, што працуюць у калгасах і саўгасах, даследчых станцыях, у сельскагаспадарчых навучальных установах і навукова-даследчых інстытутах, на прадпрыемствах, якія перапрацоўваюць сельскагаспадарчую сыравіну, у нарыхтоўчых і іншых установах і арганізацыях, звязаных з сельскагаспадарчай вытворчасцю.

У краявой, абласной партыйнай арганізацыі адпаведна мець:

— краявы, абласны камітэт партыі па кіраўніцтву прамысловай вытворчасцю;

— краявы, абласны камітэт партыі па кіраўніцтву сельскагаспадарчай вытворчасцю.

3. З мэтай паляпшэння кіраўніцтва народнай гаспадаркай прызнаць мэтазгодным утварэнне ў Цэнтральным Камітэце КПСС, у ЦК кампартый саюзных рэспублік Бюро ЦК па кіраўніцтву прамысловай вытворчасцю і Бюро ЦК па кіраўніцтву сельскагаспадарчай вытворчасцю.

Для вырашэння пытанняў агульнарэспубліканскага значэння і каардынацыі дзейнасці галіновых бюро выбіраць у Цэнтральных Камітэтах кампартый саюзных рэспублік Прэзідыум ЦК.

4. Лічыць мэтазгодным мець вытворчыя калгасна-саўгасныя ўпраўленні, якія ўтвараюцца на аснове ўзбуйнення цяпер існуючых сельскіх раёнаў, і стварэнне партыйных камітэтаў вытворчых упраўленняў узамен сельскіх райкомаў партыі.

Для кіраўніцтва партыйнымі арганізацыямі прадпрыемстваў і будоўляў, размешчаных на тэрыторыі новаўтвараемых сельскіх вытворчых упраўленняў, дзе няма гаркомаў партыі, мець зональныя (куставыя) прамыслова-вытворчыя партыйныя камітэты.

5. Устанавіць, што новаствораныя партыйныя органы па кіраўніцтву прамысловай вытворчасцю і сельскагаспадарчай вытворчасцю за ўсёй сваёй дзейнасці кіруюцца адпаведнымі палажэннямі Статута КПСС аб краявых і абласных партарганізацыях, а партыйныя камітэты вытворчых калгасна-саўгасных упраўленняў — палажэннямі Статута КПСС аб гарадскіх і раённых партыйных арганізацыях.

6. Для выбрання новых кіруючых партыйных органаў правесці ў снежні 1962 года і ў студзені 1963 года канферэнцыі партыйных арганізацый вытворчых калгасна-саўгасных упраўленняў, а таксама гарадскія, раённыя ў гарадах, абласныя і краявыя канферэнцыі прамысловых і сельскагаспадарчых партыйных арганізацый.

II.

У галіне гаспадарчага кіравання прамысловасцю, будаўніцтвам і планавання:

1. З мэтай правядзення адзінай тэхнічнай палітыкі ў народнай гаспадарцы прызнаць мэтазгодным перабудаваць кіраўніцтва навукова-даследчымі і канструктарскімі арганізацыямі. Для гэтага:

а) перадаць вядучыя навуковыя, праектныя і канструктарскія інстытуты, канструктарскія бюро заводаў з вопытнымі і эксперыментальнымі базамі ў веданне дзяржаўных камітэтаў Савета Міністраў СССР па галінах прамысловасці;

б) ускласці на дзяржаўныя камітэты адказнасць за ўкараненне новай тэхнікі і тэхналогіі ў вытворчасць, за тэхнічны ўзровень развіцця данай галіны і спецыялізацыю прамысловай вытворчасці;

в) абавязаць дзяржаўныя камітэты па галінах прамысловасці спецыялізаваць навукова-даследчыя, праектныя і канструктарскія арганізацыі на стварэнні пэўных тыпаў машын і абсталявання з максімальнай уніфікацыяй вузлоў і дэталей;

г) улічваючы размах капітальнага будаўніцтва ў краіне і неабходнасць карэннага паляпшэння кіраўніцтва гэтай справай, больш хуткага пераходу на будаўніцтва па тыпавых праектах, рэарганізаваць Дзяржбуд СССР у саюзна-рэспубліканскі орган, падпарадкаваць яму праектныя і навукова-даследчыя арганізацыі ў галіне будаўніцтва, апрача праектных арганізацый міністэрстваў энергетыкі і электрыфікацыі і транспартнага будаўніцтва, і ўскласці на Дзяржбуд адказнасць за правядзенне тэхнічнай палітыкі ў галіне капітальнага будаўніцтва і зацвярджэння тытульных спісаў.

2. Лічыць мэтазгодным выдзеліць будаўнічыя арганізацыі з ведання саўнаргасаў. Стварыць самастойныя будаўнічыя арганізацыі або аб'яднані ў рэспубліках і эканамічных раёнах, пакінуўшы за саўнаргасамі функцыі заказчыка.

3. Даручыць Дзяржаўнаму камітэту Савета Міністраў СССР па каардынацыі навукова-даследчых работ і Прэзідыуму Акадэміі навук СССР сумесна с Саветамі Міністраў саюзных рэспублік распрацаваць прапановы па паляпшэнню дзейнасці Акадэміі навук СССР і акадэмій навук саюзных рэспублік, маючы на ўвазе сканцэнтраваць навуковыя сілы на вырашэнні карэнных задач, непасрэдна звязаных з развіццём вытворчасці.

4. Адобрыць меры, змешчаныя ў дакладзе таварыша М. С. Хрушчова, па далейшаму ўзбуйненню саветаў народнай гаспадаркі з улікам эканамічнай агульнасці асобных раёнаў.

5. У сувязі з узбуйненнем саўнаргасаў і прадпрыемстваў даручыць Савету Міністраў СССР:

а) перагледзець прававое палажэнне саўнаргасаў, прадугледзеўшы, каб саўнаргасы былі надзелены шырокімі правамі, вызвалены ад дробязнай апекі, маглі праяўляць вялікую самастойнасць у вырашэнні гаспадарчых пытанняў, у выкарыстанні рэзерваў павелічэння прамысловай вытворчасці;

б) распрацаваць і прадставіць на зацвярджэнне Вярхоўнага Савета СССР праект закона аб сацыялістычным прадпрыемстве, маючы на ўвазе далейшае расшырэнне правоў дырэктараў прадпрыемстваў, кіраўнікоў будаўнічых арганізацый і больш актыўны ўдзел працоўных у кіраванні вытворчасцю.

6. У інтарэсах паляпшэння перспектыўнага планавання развіцця народнай гаспадаркі краіны і кіраўніцтва рэалізацыяй планаў па гадах неабходна ажыццявіць больш дакладнае размежаванне функцый паміж цэнтральнымі планавымі органамі.

З гэтай мэтай перадаць функцыі Дзяржплана СССР, які ажыццяўляе цяпер рэалізацыю перспектыўных планаў па гадах, новаму органу — Савету народнай гаспадаркі СССР (СНГ СССР), надаўшы яму неабходныя распараджальныя функцыі. Пераўтварыць Дзяржэканамсавет у Дзяржплан СССР, усклаўшы на яго перспектыўнае планаванне.

III.

У галіне партыйна-дзяржаўнага кантролю:

1. Рэарганізаваць сістэму кантролю ў краіне, паклаўшы ў яе аснову ленінскае ўказанне аб спалучэнні партыйнага і дзяржаўнага кантролю, стварэнні сістэмы адзінага пастаянна дзеючага кантролю з удзелам у ім шырокіх мас працоўных.

2. Утварыць адзіны орган партыйнага і дзяржаўнага кантролю — Камітэт партыйна-дзяржаўнага кантролю ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР і адпаведныя органы на месцах.

Лічыць важнейшай задачай органаў партыйна-дзяржаўнага кантролю аказанне дапамогі партыі і дзяржаве ў выкананні Праграмы КПСС, у арганізацыі сістэматычнай праверкі выканання дырэктыў партыі і ўрада, у далейшым удасканаленні кіраўніцтва камуністычным будаўніцтвам, у захаванні партыйнай і дзяржаўнай дысцыпліны і сацыялістычнай законнасці.

3. Пераўтварыць цяпер дзеючы Камітэт партыйнага кантролю пры ЦК КПСС у Партканісію пры ЦК КПСС, усклаўшы на яе абавязак разгляду апеляцый на рашэнні ЦК кампартый саюзных рэспублік, краявых і абласных камітэтаў партыі аб выключэнні з КПСС і партыйных спагнаннях.

4. Лічыць немэтазгодным захаванне ў далейшым Камісіі дзяржаўнага кантролю Савета Міністраў СССР і яе органаў на месцах.

* * *

Пленум ЦК КПСС падкрэслівае, што перабудова партыйнага кіраўніцтва народнай гаспадаркай па вытворчаму прынцыпу стварае спрыяльныя ўмовы для хутчэйшага ажыццяўлення рашэнняў XXII з'езда КПСС аб развіцці прамысловасці, будаўніцтва, транспарту, сельскай гаспадаркі і ўздыме жыццёвага ўзроўню народа.

Цяпер наша Радзіма знаходзіцца на парозе пятага года сямігодкі, калі савецкаму народу трэба ўзяць новыя рубяжы ў прамысловасці і сельскай гаспадарцы, ва ўсіх галінах эканомікі. Цэнтральны Камітэт КПСС заклікае рабочых, калгаснікаў, інжынерна-тэхнічных работнікаў, усіх працоўных, камуністаў і беспартыйных сваёй самаадданай працай забяспечыць выкананне народнагаспадарчага плана 1963 года і тым самым зрабіць новы буйны крок на шляху будаўніцтва камунізма.

Цэнтральны Камітэт партыі выказвае ўпэўненасць, што ажыццяўленне перабудовы партыйнага кіраўніцтва прамысловасцю, будаўніцтвам і сельскай гаспадаркай знойдзе поўную падтрымку і адабрэнне ўсёй партыі, усяго народа і з'явіцца важным сродкам у забеспячэнні паспяховага выканання вялікай Праграмы будаўніцтва камунізма, прынятай XXII з'ездам Камуністычнай партыі Савецкага Саюза.

У Прэзідыуме Вярхоўнага Савета СССР

Указамі Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР назначаны:

Палянскі Дзмітрый Сцяпанавіч — намеснікам Старшыні Савета Міністраў СССР;

Шалепін Аляксандр Мікалаевіч — намеснікам Старшыні Савета Міністраў СССР і Старшынёй Камітэта партыйна-дзяржаўнага кантролю ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР;

Лясечка Міхаіл Аўксеньцьевіч — намеснікам Старшыні Савета Міністраў СССР;

Ламака Пётр Фадзеевіч — старшынёй Дзяржаўнага планавага камітэта Савета Міністраў СССР;

Дымшыц Веніямін Эмануілавіч — Старшынёй Савета народнай гаспадаркі СССР;

Новікаў Ігнат Трафімавіч — намеснікам Старшыні Савета Міністраў СССР і старшынёй Дзяржаўнага камітэта Савета Міністраў СССР па справах будаўніцтва;

Непарожні Пётр Сцяпанавіч — міністрам энергетыкі і электрыфікацыі СССР.

«РАЗВІЦЦЁ ЭКАНОМІКІ СССР І ПАРТЫЙНАЕ КІРАЎНІЦТВА НАРОДНАЙ ГАСПАДАРКАЙ»

БРАШУРА З ТЭКСТАМ ДАКЛАДА М. С. ХРУШЧОВА НА ПЛЕНУМЕ ЦК КПСС

Выдавецтва палітычнай літаратуры выпусціла ў свет брашуру з тэкстам даклада М. С. Хрушчова на Пленуме ЦК КПСС 19 лістапада 1962 года «Развіццё эканомікі СССР і партыйнае кіраўніцтва народнай гаспадаркай».

Брашура выдадзена масавым тыражом.

ПРАВІЛЬНА, ТАВАРЫШ ПАРТЫЯ!

ПІСЬМЕННІЦКАЕ СЛОВА — ТАКСАМА КАНТРОЛЬ

Шмат пачуццяў выклікае даклад Мікіты Сяргеевіча Хрушчова на Пленуме ЦК КПСС. Гэта і гордасць за вялікія поспехі Радзімы, самаадданую працу савецкага чалавека; і роздум аб тым, як ты асабіста можаш і павінен дапамагчы партыі ў выкананні велічных і адказных задач; і творчы неспакой. Я чытаў даклад і думаў, якое шырокае поле дзейнасці для пісьменніка, якія канфлікты, праблемы, характары! І яшчэ аб адным з горыччу падумаў я. Як рэдка ўсё ж карыстаемся мы магутным словам публіцыстыкі для ўслаўлення чалавечай прыгажосці, для выкрыцця чалавечых заганаў! Як рэдка выкарыстоўваем мы, пісьменнікі, такія магутныя і даходлівыя трыбуны, як газета, радыё, тэлебачанне.

Я добра разумею, што калі працуеш над вялікім раманам — вельмі цяжка адарвацца ад пісьмовага стала, каб па просьбе рэдакцыі газеты, радыёкамітэта паехаць на будоўлю, у калгас, напісаць нарыс, артыкул. Я добра разумею, што таленавіты раман — гэта таксама пісьменніцкі ўклад у агульную справу, бо калі твая кніга дайшла да сэрца чытача, прымусіла яго яшчэ лепш жыць і працаваць — гэта не толькі твая асабістая радасць, але і твая канкрэтная дапамога партыі ў вырашэнні вялікіх задач. І ўсё ж ёсць такія рэчы, якія патрабуюць неадкладнага, аператыўнага слова публіцыста.

Возьмем, напрыклад, такое пытанне, якое з вялікай прынцыповасцю ўзняў у сваім дакладзе М. С. Хрушчоў, — пытанне аб кантролі за выкананнем рашэнняў партыі. Мы бачым, як настойліва ажыццяўляе партыя ленінскія запаветы аб сувязі з народам, аб прыцягненні народных мас да шырокага кантролю і ў вялікім і малым, кантролю ад нізу да верху. Партыя заклікае ўсю нашу грамадскасць узняць свой рашучы голас супраць бюракратаў, абібокаў, хабарнікаў, злодзеяў, хлусоў, — супраць усіх тых, хто любіць пагрэць рукі ля дзяржаўнага багацця, хто перашкаджае нашай хадзе наперад. Увесь народ становіцца кантралёрам над сваімі здабыткамі, над сваім багацтвам! Пісьменніцкае слова — таксама кантроль! Будзем жа часцей — страсна, прынцыпова, даходліва карыстацца гэтым словам!

Ул. ДАДЗІЁМАЎ.

ПА ЎСЁЙ РЭСПУБЛІЦЫ

Прапаганда матэрыялаў Пленума ЦК КПСС — вось асноўнае пытанне, якім займаюцца культасветустановы рэспублікі ў гэтыя дні. Асабліва дзейна працуюць бібліятэчныя работнікі. У рабочых і масавых бібліятэках, сельскіх клубах арганізаваны выстаўкі і мантажы, праводзяцца гутаркі аб гістарычным Пленуме. Вось што паведамляюць нам у рэдакцыю:

Мінск. У Дзяржаўнай бібліятэцы імя Ул. І. Леніна арганізавана вялікая выстаўка перыядычнай літаратуры. На ёй — газеты з дакладам М. С. Хрушчова на Пленуме ЦК КПСС, выступленнямі ўдзельнікаў Пленума і Пастановай Пленума ЦК КПСС, брашуры аб развіцці прамысловасці і гаспадаркі нашай краіны.

Слуцк. — У нас штодзённа робіцца больш 400 кнігавыдач, — паведамляе загадчыца гарадской бібліятэкі А. Касцян. — Наведвальнікі вывучаюць гістарычныя матэрыялы Пленума. Бібліятэка папаўняецца новай літаратурай па пытаннях прамысловасці, сельскай гаспадаркі, эканомікі.

Талачын. — Гутарку аб рабоце Пленума ЦК КПСС правяла з наведвальнікамі раённай бібліятэкі загадчыца хатняга абанемента В. Кізіла. Чытачы горача абмяркоўваюць Пастанову Пленума ЦК КПСС.

Брэст. — «Рашэнні лістападаўскага Пленума» — так называецца выстаўка ў абласной бібліятэцы імя Горкага, — расказвае бібліятэкарка Р. Баркоўская. — На выстаўцы шмат грамадска-палітычнай, сельскагаспадарчай і прамысловай літаратуры.



Студэнткі бібліятэчнага факультэта Мінскага педагагічнага інстытута імя М. Горкага Лідзія Навінская і Марыя Радзінская, якія праходзяць практыку ў бібліятэцы імя Я. Купалы, падбіраюць матэрыялы Пленума ЦК КПСС для афармлення стэнда.

Прыгажосць і мэтазгоднасць

НАСУСТРАЧ СОНЦУ і ПАВЕТРУ

„РОДНЫ Мінск, мая сталіца...»—ляціць бадзёрая песня недзе зверху. Задзіраю галаву і бачу ў адчыненым акне маладога чалавека—гаспадара кватэры ў новым доме, які толькі ўчора засялілі. Мусіць, сапраўды сэрца чалавека перапоўнена радасцю, калі ён, не бянтэжачыся нікога, абвяшчае пра яе ўголас. Ужо не на сотні, а на тысячы лічым мы наваселлі, што адбываюцца ў горадзе за год.

І прыезджаму чалавеку і карэннаму мінчаніну кідаецца ў вочы грандыёзны размах будаўніцтва беларускай сталіцы. Гораду стала цесна ў яго рамейшых рамках і дарожнікі штогод усё далей «у поле» адносяць слупкі гарадской мяжы. Цэлыя вёскі (Дражня, Слепня) паглынуў горад і ўжо наступае на блізкія і далёкія прыгарады (Лошыца, Пятроўшчына, Дразды, Уручча, Трасцянец). Як тут не ўзрадавацца і навасельцу і старажылу.

Але калі наваселец, пазбаўлены магчымасці параўнання, дык старажыл не толькі цешыцца, а бывае і незадаволены, нават раззлаваны. «Хіба ім няма іншага занятку, як засыпаць народныя грошы зямлёй?»—пачуў я неяк улетку ад чалавека немаладога ўжо веку. Ён спыніўся на тратуары па вуліцы Карла Маркса, дзе ішоў яе капітальны рамонт, і дакорліва глядзеў на тых, хто паленаваўся ўздзёрці стары асфальт і насыпаў на яго пласт пяску і гравію, каб потым рабіць новае пакрыццё.

Шмат добрага зроблена і робіцца тымі, хто будуе горад. Але нямала сустракаецца і глупства, часам, проста-такі недаравальнага. І ўсё гэта таму, што за зробленае глупства асабіста ніхто не адказвае, што горадабудаўнікі не робяць справаздачы перад шырокай грамадскасцю. Газета «Літаратура і мастацтва», па-сутнасці, упершыню за пасляваенныя гады спрабуе абмеркаваць вельмі надзённую праблему — прыгажосць і мэтазгоднасць у будаўніцтве нашых гарадоў.

Мінчанам і іх гасцям ёсць чым захапляцца. І яны захапляюцца прыгожымі ансамблямі на Ленінскім праспекце, утульнасцю новых паркаў і сквераў, велічнасцю карпусоў завода аўтаматычных ліній, грацыёзнасцю асобных жылых будынкаў, цудоўнай панарамай некаторых раёнаў комплекснай забудовы.

Радуючыся значным здабыткам свайго роднага горада, які, як та» агністая птушка ў казцы, вырас з руін і попелу, мы не можам заплюшчваць вочы і на тое, як горадабудаўнікі залішне захапляліся ды і цяпер захапляюцца парадным бокам сваёй справы і забываліся (ды і забываюцца) на апраўданасць многіх задум патрэбамі сённяшняга дня і на мэтазгоднасць іх у бліжэйшай будучыні. Мы не можам заставацца абыякавымі і да той непрынцыповай пазіцыі, якую часта займалі і займаюць архітэктары, не дамагаючыся ад будаўнікоў паўнацэннага выканання праектаў. Ці не залішне шмат кампрамісаў робяць тыя, на чыё пільнае вока, руплівы характар, цвярозы розум, дальнабачную празарлівасць спадзяёмся мы?

Архітэктар сёння не можа быць толькі добрым мастаком-выканаўцам і інжынерам-канструктарам, ён павінен быць перш за ўсё змагаром за свае ідэі. А для гэтага яму трэба быць і гісторыкам, і эканамістам, і прыродазнаўцам, і, вядома, заўсёды — гуманістам. «Усё для чалавека, на карысць чалавецтва»—напісаў на сцягу эпохі гістарычны XXII з'езд Камуністычнай партыі. Тым самым з'езд вызначыў і характар дзейнасці тых, хто арганізуе, стварае месцы для працоўнай, творчай дзейнасці чалавека і яго адпачынку.

Скрозь: і на працы, і дома, і на вуліцы, і ў парку, і ў прыгарадзе чалавек хоча сустрэць задавальненне самых разнастайных, адпаведных свайму характару патрэб і густаў, мець уцеху для вока, асалоду для сэрца. Настрой чалавека залежыць ад умоў, у якіх ён жыве і працуе, а настрой самым непасрэдным чынам уплывае на працаздольнасць.

Але ж ці можа быць творчы настрой у чалавека, якога пасялілі ў кватэру, куды ніколі не заглядае сонца і ў якой усё калоціцца ад вулічнага грукату? Ці можа гэты настрой палепшыцца, калі і ў цаху ён вымушан цэлую змену быць пры штучным асвятленні і бачыць шэры, брудны колер вакол? Не ўзнімаецца ў яго настрой, калі, прыйшоўшы пасля работы ў сталовую ці кафэ, клуб ці кінатэатр, ён не адчуе там прасторы, святла, подыху свежага паветра і зручнасці ва ўсім.

На вялікі жаль, многае з таго, што ўжо збудавана ў Мінску, не заўсёды скіравана на забеспячэнне добрага настрою ў людзей. Гэта адчуваецца і ў не зусім прадуманай планіроўцы цэнтра і ўскраін, у пэўнай абыякавасці да прыродных умоў горада, да яго гісторыі, у пагардзе да эканамічнай мэтазгоднасці пры ўстанаўленні чарговасці забудовы, у няўменні аб'яднаць намаганні будаўнікоў, архітэктараў, мастакоў, садаводаў і самадзейнай ініцыятывы жыхароў, каб зрабіць горад утульным, прыгожым, сучасным і, вядома ж, **горадам будучыні.**

СПРАДВЕКУ гарады будаваліся так, каб скарыстаць для хараства і зручнасці ў найбольшай ступені тое, што прыгатавана прыродай—узвышшы, рэкі, яры, лясы, астравы... Так выраслі Масква і Кіеў на ўзвышшах пры берагах вялікіх рэк, Ленінград на сто адным востраве неўскай дэльты, Венецыя на сотнях лагун... Прыродныя ўмовы і перш за ўсё рэльеф моцна ўплывалі на вырашэнне як сілуэта, так і прасторавай планіроўкі гэтых гарадоў, памагалі архітэктарам скарыстаць самыя рацыянальныя прынцыпы для іх забудовы.

Прырода не дала Мінску нават адной людскай ракі, але затое падаравала яму тры выразныя ўзгоркі, атуліла яго лясамі. Старажылы, людзі майго веку, памятаюць Траецкую гару (цяпер плошча Парыжскай Камуны), Высокае места (цяпер плошча Свабоды), Залатую горку (скрыжаванне Ленінскага праспекта і Даўгабродскай вуліцы). Гэтыя ўзвышшы як прыродныя акцэнты пры першапачатковай забудове Мінска былі пэўным чынам падкрэслены і стваралі сілуэт, які запамінаўся надоўга.

Спакойны, не надта перасечаны рэльеф быў скарыстаны архітэктарамі і пры пасляваеннай адбудове горада, але не да канца. Удала ўпісаныя ў ландшафт выглядаюць трактарны і падшыпнікавы заводы ды пасёлак трактаразаводцаў, забудова раёна ля возера. Кампазіцыйнае вырашэнне генеральнага плана цэнтральнай часткі горада магло быць выразнейшым і куды больш маляўнічым, калі б удумліва паставіліся да тых узгоркаў, на якіх спрадвеку будаваўся Мінск. Аднак жа захапленне празмерным нівеліраваннем рэльефу, якое трывае і сёння, вядзе толькі да падражання асобных будоўляў. Калі б хто сабраў у адно месца ўсю тую зямлю, якую перавярнулі за пасляваенныя гады экскаватары і бульдозеры, перавезлі з месца на месца (часам па некалькі разоў) самазвалы, мусіць вырас бы не адзін Эльбрус. А ці заўсёды выклікалася гэта разумным выбарам найбольш аптымальнага вырашэння забудовы таго або іншага квартала?

Выпрастанне і выроўніванне Ленінскага праспекта, мне здаецца апраўдана імкненнем зрабіць яго не толькі асноўнай транспартнай, але і перш за ўсё парадной магістраллю горада. Праўда, і тут не абышлося без агрэхаў. Яны на відавоку. Прыгадайце тыя 5—7 прыступкаў, якія вам трэба вымераць, перш чым трапіць у магазін ці сталоўку, што размешчаны на праспекце паміж вуліцамі Леніна і Энгельса.

Але не будзем чапіцца да дробязей, а пройдземся праспектам, глянем на тыя вуліцы, што прымыкаюць да яго на плошчы, якія ён праразае, на ўсё тое, што вырашалася, — падпарадкавана цэнтральнай восі горада.

Найбольш удала з эстэтычнага і практычнага пункту гледжання выглядаюць вуліцы Янкі Купалы і Камуністычная. Тэрасная забудова высокага (левага) берагу р. Свіслач (у кірунку да вуліцы Горкага) стварае карціну поўнай гармоніі прыроды і гарадскіх збудаванняў. Тое ж самае можна сказаць і пра вуліцу Захарава, дзе непарушаны рэльеф і ўзгодненая з ім вышыня будынкаў робяць уражанне стройнага архітэктурнага ансамблю амаль на ўсім яе працягу. І па вуліцах Янкі Купалы ды Камуністычнай удалося дасягнуць стройнага сілуэта гэтай часткі горада. Прыгадайце, якую кантрасную сілуэту надаюць размешчаныя на самым высокім месцы адміністратыўны будынак з класічным порцікам і ўвенчаны шпілем жылы дом побач ды іх адлюстраванне ў рацэ!

Перспектыва — гэта тое, што напарадзе, што вабіць вас ісці далей і далей, каб там, за небасхілам, сустрэць новую далячынь. Як важна для архітэктара арганізаваць перспектыву кожнай вуліцы, плошчы, іменна так, каб яна клікала ісці ўсё наперад і наперад. Чаргаванне на Ленінскім праспекце адкрытай і замкнутай перспектыў робяць яго дынамічным аж да плошчы Леніна, дзе перспектыва раптам знікае, растваряецца. Менш удала вырашаны пакуль папярэчныя перспектывы праспекта. «Крывакаленныя» адцінкі вуліцы Леніна (управа) ці Камсамольскай (улева), замыканне перспектывы вуліцы Фрунзе глухой сцяной халадзільніка, што па Першамайскай вуліцы, — усё гэта вынікі непрадуманых вырашэнняў агульнай планіроўкі цэнтра.

Той жа непрадуманасцю можна вытлумачыць заслоны, што ўзніклі перад вачыма на некаторых кульмінацыйных пунктах гарадскога рэльефу. З грэбня вуліцы Карла Маркса (на рагу Чырвонаармейскай) добра глядзелася б водная прастора р. Свіслачы, арачны мост праз яе і будынак цырка, калі б жылы дом на рагу вуліц К. Маркса і Я. Купалы не засланіў усё гэта. На пераломе Чырвонаармейскай вуліцы супраць вучэбнага корпуса універсітэта адкрывалася цудоўная панарама на Заводскі раён сталіцы, пакуль не засціў яе будынак Дома юных тэхнікаў. (Дарэчы спытаецца ў горадабудаўнікоў, чым тлумачыцца, што «ўсё дзіцячае» — парк культуры і адпачынку, Палац піянераў, Тэатр юнага гледача, дзіцячы кінатэатр, Дом юных тэхнікаў збіты ў кучу? Ці не крыўдна дзецям ускраін, што архітэктары абмінаюць іх сваёй увагай?).

Усе такога парадку недагляды і промахі маглі б быць папярэджаны, калі б праекты планіроўкі асобных раёнаў, кварталаў, вуліц, плошчаў выстаўляліся на шырокае абмеркаванне. Кажуць, існуе пры гарадскім архітэктары грамадскі будаўнічы савет, але што ведае шырокая грамадскасць пра яго работу? Нічога. Невядомы нават састаў яго. Мусіць, не пашкодзіла б на гэтым савеце часам і шчырае слова пісьменніка.

У САМЫМ пачатку артыкула «Новае — пановаму!» архітэктар А. Таф выказаў думку пра тое, што «пры рэканструкцыі такіх гарадоў са шматвяковай гісторыяй, як Мінск і некаторыя абласныя цэнтры нашай рэспублікі, творчыя магчымасці архітэктараў часта бываюць абмежаванымі, ім даводзіцца зыходзіць са спрадвечных горадабудаўнічых сітуацый». Не ведаю, як іншыя гарады, а ў Мінску архітэктары і будаўнікі нібы знарок пастараліся, каб нічога ў ім не напамінала пра амаль тысячагадовую гісторыю. Нават гісторыкам не далі магчымасці дакончыць раскопкі старога замчышча на плошчы 8 сакавіка і збудавалі Палац спорту іменна на тым месцы, дзе яшчэ трэба было колькі часу папрацаваць археолагам.

Колькі было адразу пасля вайны жалезабетонных бункераў, збудаваных гітлераўцамі ў страху перад грозным мсціўцамі — падпольшчыкамі ды партызанамі! Навошта было іх усе да аднаго разбураць? А загароды з калючага дроту, самотныя абломкі сцен? Гэта ж жывыя сведкі нядаўняй яшчэ гераічнай гісторыі. Гляньце, колькі наведвальнікаў збірае вакол сябе танк, што ля Дома афіцэраў?

Некалі М. Ю. Лермантаў пісаў: «Масква не маўклівая груда камянёў халодных, састаўленых у сіметрычным парадку... не! У яе ёсць свая душа, сваё жыццё!» Беларчы разумна гатае жыццё, не трывожыць без патрэбы душу горада — вось пра што не павінны забываць архітэктары і будаўнікі. І на прыкладзе той жа Масквы відаць, як беражліва ставяцца там да ўсяго, што звязана з гісторыяй сэрца нашай Радзімы. Прыгадайце хоць бы плошчу Дзяржынскага, якая на кожнага робіць уражанне ўдумлівага спалучэння гісторыі і сучаснасці. А Палац з'ездаў у Крамлі!

Ідучы ж па вуліцах Мінска, старажылам яго часам да болю ў сэрцы становіцца крыўдна за патаптаную дарэшты не такую ўжо і багатую гісторыю беларускай сталіцы. У агульным захапленні новым мы не заўважаем часам прыкрай абыякавасці архітэктурнай думкі да гістарычнага мінулага свайго народа, а то і проста няведання асаблівасцей гісторыі Беларусі, якая заўсёды была на скрыжаванні вялікіх падзей сусветнага маштабу. Стары Мінск — спачатку як правінцыяльны, а потым губернскі горад меў своеасаблівую забудову. Цэхаўшчына і саматужніцтва ў забудове жылых кварталаў тут ужываліся побач з яркімі ўзлётамі архітэктурнай думкі, укладзенымі ў збудаванні рэлігійных устаноў, багатых гандлёвых дамоў, асабнякоў дваранскай і купецкай знаці. Усё гэта мы не паспелі вывучыць, як грымнула вайна і многае з самага прыгожага і каштоўнага знішчыла.

Было б неразумным траціць народныя сродкі на адбудову таго, што пайшло прахам, але ж яшчэ больш неразумна даломваць уцалелае, каб займацца ўпрыгожваннем дзеля ўпрыгожвання. Не будзем папракаць таго чалавека, які з лёгкасцю спрактыкаванага чарцёжніка, не адрываючы рукі ад планшэта выводзіў доўгую (аж на цэлы квартал па вуліцы Леніна) аркаду, а потым аздабляў яе зверху безліччу выкрунтасаў на фасадзе, не клапоцячыся ні пра час, ні пра сродкі, звязаныя з выкананнем гэтых практыкаванняў. Хай гэта застанецца данінай часу, калі працвітала бязглуздая раскошнасць архітэктурнай казённшчыны.

Узыдзем на плошчу Свабоды, што называлася некалі Высокім местам і праз стагоддзі склалася

(Заканчэнне на 4-й стр.).

ЗАКАНЧЫЎСЯ агляд мастацкай самадзейнасці горада Мінска. Ужо можна падвесці некаторыя вынікі і выказаць пажаданні. Нельга, вядома, абысціся тут без крытычных заўваг у адрас некаторых калектываў і асобных выканаўцаў.

У гэтым артыкуле гаворка пойдзе толькі пра хоры і салістаў-вакалістаў.

Першае, што хацелася б адзначыць, — узрослае майстэрства многіх калектываў, складзеных з удумлівых, сур'ёзных выканаўцаў. Да такіх калектываў у першую чаргу адносіцца харавая капэла трактарнага завода (кіраўнік В. Рагавіч). Чысціня інтанацыі выканання, прадуманы падбор рэпертуару, сур'ёзныя адносіны і кіраўніка і ўдзельнікаў капэлы да сваёй праграмы робіць спяванне а капэла не цяжкім для калектыву. Уся праграма яго стварае прыемнае ўражанне. Добра б было як мага шырэй пазнаёміць грамадскасць нашага горада з дасягненнямі гэтай харавой капэлы, скажам, праз арганізацыю адкрытых канцэртаў. Відаць, гарадскому ўпраўленню культуры трэба будзе пра гэта падумаць.



З заключнага канцэрта агляду мастацкай самадзейнасці горада Мінска. На здымках—выступленне аркестра народных інструментаў Дома культуры мясцовай прамысловасці і танцавальная сюіта «Віва, Куба!» у выкананні калектыву народнага ансамбля танца трактарнага завода.

Фота Ул. КРУКА.

КАБ ПЕСНЯ БЫЛА ХАРОШАЙ І ЗВОНКАЙ

Не горш выступіла харавая народная капэла Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя Ул. І. Леніна (кіраўнік Л. Лях). Гэта калектыў са значнымі магчымасцямі: у ім вялікая мужчынская група, добрыя, ураўнаважаныя паміж сабою жаночыя галасы. На аглядзе найбольшае ўражанне пакінуў «Сказ пра Ламаносава» А. Новікава, выкананы ў суправаджэнні фартэпіяна, творы ж, праспяваныя а капэла, былі менш выразныя. Усё гэта не значыць, што капэла павінна адмовіцца ад суправаджэння фартэпіяна, але да такога калектыву мы маем права ставіць больш высокія патрабаванні.

Парадавалі сваімі выступленнямі народная харавая капэла Палаца прафсаюзаў (кіраўнік І. Клёнскі), харавая капэла педагагічнага інстытута імя Горкага (П. Грыгорчанка), хор клуба імя Дзяржынскага (А. Гяцэвіч).

Вось, бадай, і ўсе мінскія харавыя калектывы, якія нечым вызначаліся. Вядома, для сталіцы пяць харавых калектываў яўна мала. Чаму ж кіраўнікі Мінскага аўтазавода не задумаюцца над тым, што ў іх фактычна няма харавой капэлы, хаця такі здольны, даследчаны кіраўнік, як В. Баратнікоў, мог бы памагчы стварыць яе. Чаму такая капэла можа існаваць у іх суседа, на трактарным заводзе? Праўда, на аўтазаводзе ёсць добры мужчынскі хор інтэрната (кіраўнік Н. Ільчоў), але, акрамя гэтага, такое вялікае прадпрыемства магло б мець добрую харавую капэлу.

Узнікае і другое пытанне: чаму на такіх прадпрыемствах, як тонкасуконны і камвольны камбінаты, у многіх навучальных установах — Беларускім політэхнічным інстытуце, інстытуце народнай гаспадаркі і інш., на многіх мінскіх фабрыках і заводах няма харавых калектываў або ёсць такія хоры, пра якія сур'ёзна гаварыць нельга? Наш жа народ любіць песню, любіць спяваць. Трэба толькі пастарацца і хутка паявяцца новыя, таленавітыя харавыя калектывы.

З хораў, што спяваюць у народнай манеры, заслугоўваюць увагі народны маладзёжны хор Палаца прафсаюзаў (кіраўнік Н. Хаўхлянцаў), народны хор будаўнічага трэста № 5 (кіраўнік Г. Ударай) і народны хор Дома культуры аўтазавода (кіраўнік А. Нініціна). Трэба пажадаць хору будаўнічага трэста больш падпарадкаваць аркестравае суправаджэнне спяванню. Гэта зробіць тэкст больш выразным, паможа лепш успрымаць песні. На мой погляд, хору Дома культуры аўтазавода трэба падумаць над тым, каб, запрыклад, у песні «Расія» (музыка Тулікава) ліквідаваць разрыў паміж салісткай і хорам. Магчыма, трэба было б назваць гэты калектыў хорам рускай песні тэму што ў яго рэпертуары толькі рускія песні. Назва ж — народны хор — разумеецца намі больш шырока.

На аглядзе выступалі вакальныя ансамблі — жаночы мотавелазавода (кіраўнік А. Лук'янюк), мужчынскі актэт фабрыкі імя Калініна (Л. Ляноўскі). Гэтыя калектывы паказалі нядрэнную падрыхтоўку, добрае пачуццё ансамбля, строй. Думаю, што і такія ансамблі там, дзе няма магчымасці стварыць паўнацэнны хор, могуць дасягнуць вялікіх мастацкіх вынікаў. Форму ансамблевага спявання трэба ўсяляк падтрымліваць і заахвочваць.

Пераходзячы да агляду выступленняў салістаў-вакалістаў, перш за ўсё, хацелася б адзначыць вельмі добрыя вакальныя і музычныя дадзеныя многіх салістаў, што спявалі на аглядзе. Да такіх адносяцца настройшчыца радыёзавода Л. Мартынюк, інжынер Б. Палякоў, загадчык аптэкі Ю. Дзяргун, кранаўшчыца аўтазавода Н. Лісоўская, юрыст Г. Чарнышоў, урач Н. Затонец і многія іншыя. Менавіта гэтыя выканаўцы могуць быць прыкладам дасканалай манеры выканання, добрага густу. Даводзіцца з жалем прызнаць, што ў час раённых агляду сустракаліся выканаўцы, якія не адпавядаюць гэтым элементарным патрабаванням. Многія выканаўцы паводзяць сябе на сцэне развязна, карыстаюцца мікрафонам. Але нават мікрафон не выратуе, калі няма голасу. Часта выканаўцы не разумеюць таго, што спяваюць. Прыкладам можа служыць песня В. Мурадэлі «Бухенвальдскі набат», якую выконвалі многія салісты ў манеры, што не адпавядала тэме: у іх атрымліваўся інтымны расказ праз мікрафон.

Салістам-вакалістам трэба больш строга падыходзіць да магчымасцей свайго голасу, больш сур'ёзна выбіраць творы для выканання, а не браць любую песню, абы спадабалася. Яшчэ горш, калі яны капіруюць некаторых выканаўцаў, прычым часта не лепшых. Трэба шукаць сваю, індывідуальную манеру выканання. Толькі тады магчымы сапраўдныя мастацкія дасягненні.

У гэтым артыкуле я не ставіў за мэту даць вычарпальны аналіз выканаўчага майстэрства ўсіх калектываў і салістаў Мінска. Мне проста хацелася выказаць некаторыя думкі, што ўзніклі ў мяне ў час агляду. Многія калектывы, а таксама некаторых выканаўцаў я не ўспомніў, але думаю, што ўсё, што сказана мною ў артыкуле, мае дачыненне і да іх.

Юрый СЕМЯНЯКА.

СУЧАСНАСЦЬ — ДУША САМАДЗЕЙНАСЦІ

Абласны агляд мастацкай самадзейнасці Гродзеншчыны паказаў шмат цікавага.

Каля двух тысяч аматараў—спевакоў, танцораў, музыкантаў, чытальнікаў аспрэчвалі пачэснае права паехаць у ліку лепшых з лепшых у Мінск на Дэкаду самадзейнага мастацтва. А права гэта, безумоўна, застанецца за тымі, хто стала працуе і настойліва павышае сваё майстэрства.

Як і трэба было чакаць, найбольш шырока на аглядзе былі паказаны хоры. Кожны з раёнаў паказаў іх два, а то тры. У асноўным гэта змешаныя хоры з даволі вялікімі мужчынскімі групамі. Гэта дало магчымасць ім выконваць складаныя сучасныя творы, масавыя і народныя песні, а таксама класіку. Былі і акапэльныя хоры. У першую чаргу хочацца назваць народную харавую капэлу калгаса «Сцяг Саветаў» з Навагрудчыны, якая атрымала гэтае пачэснае званне адной з першых у рэспубліцы.

Нядаўна ў Гродна створаны народны ансамбль песні і танца «Нёман» (мастацкі кіраўнік А. Чопчыц). За кароткі час ён даў канцэрты ў Маскве на Выстаўцы дасягненняў народнай гаспадаркі, у Польскай Народнай Рэспубліцы і ў Мінску. На абласным аглядзе ансамбль прапанаваў увазе гледачоў вакальна-харэаграфічную кампазіцыю — «Прынямонскі край», у якой раскрыта прыгожая душа савецкага чалавека. Прыклад з ансамбля «Нёман» узялі Ліда і іншыя гарады вобласці. Яны таксама стварылі ансамблі, у рэпертуары якіх ужо ёсць сюжэтныя тэатралізаваныя паказы на сучасныя тэмы. Праўда, часта гэта яшчэ толькі пошукі, але такія творчыя імкненні заслугоўваюць самай пільнай увагі.

Трэба сказаць, што і народныя хоры імкнуцца адыходзіць ад прымітыву. Выкарыстоўваючы багатыя традыцыі народнага харавога меласу, умела карыстаючыся моцнымі прыгожымі галасамі спевакоў, кіраўнікі калектываў дамагаюцца мяккага кантыленнага выканання, пазбягаючы «крыклівасці», фарсіраванага гучання. Яркім прыкладам такога напрамку можа быць хор калгаса «Гігант» Лідскага раёна (дырыжор хормайстар А. Валынчык), які скупымі, простымі сродкамі, але вельмі выразна выканаў «Слаўся, народ беларускі» А. Валынчыка, «Ну, як жа не мець» А. Шыдлоўскага і папуры з беларускіх народных песень.

Новыя сучасныя тэмы знайшлі шырокі адбітак у творчасці харэаграфічных калектываў. Самадзейныя танцоры Гродзенскага клуба будаўнікоў (кіраўнік В. Сарокін) выканалі харэаграфічную кампазіцыю «Працоўныя будні азотнатукавага», якая адлюстроўвае жыццё, працу і адпачынак маладых будаўнікоў камунізма. Праўда, некаторая невыразнасць сюжэта і, як вынік гэтага, незаўсёды акрэсленая лагічнасць асобных сцэнак у нейкай ступені перашкаджаюць успрыманню кампазіцыі.

Заслугоўваюць увагі і два харэаграфічныя малюнкі ў выкананні танцавальнага калектыву і ўдзельнікаў агітацыйна-мастацкай брыгады «Дружба» Ашмянскага раённага Дома культуры (кіраўнік—выхавацель школы-інтэрната П. Данілаў). У першым малюнку «Што больш важна, больш патрэбна на калгасным полі», на народнай аснове, вельмі дасціпна і выразна, у спалучэнні танцаў з трапнымі частушкамі паказана барацьба за ўкраненне найбольш эфектыўных сельскагаспадарчых культур. У другім малюнку «Сямейнае шчасце» ў лірычных мяккіх танцавальных фарбах паказан адпачынак савецкай сям'і. Гэты малюнак, дарэчы, надзвычай удала выконвае сям'я П. Данілава — яго жонка, дыспетчар аўтобуснай станцыі, Маргарыта Мікалаеўна і дочкі Наташа, Марына і Алена.

На аглядзе было паказана яшчэ некалькі новых вакальна-харэаграфічных кампазіцый — «Слава калгаснай працы» (Лідскі гарадскі ансамбль песні і танца), «Лён здружыў нас з камбінатам» (ансамбль песні і танца Палаца культуры гродзенскіх тэкстыльшчыкаў). Гэтыя кампазіцыі цікавыя па сваёй задуме, але пакуль што яны не знайшлі яркага сцэнічнага ўвасаблення ўсё па той жа прычыне — з-за невыразнасці сюжэта.

Адной з важных падзей у культурным жыцці гродзенцаў трэба лічыць выступленне параўнальна вялікага (больш за 40 чалавек) самадзейнага сімфанічнага аркестра (дырыжор Э. Казачкоў). Ён мае ўсе магчымасці выконваць не толькі малыя музычныя палотны, але і сімфоніі. У праграме, паказанай на аглядзе — «Фінал другой сімфоніі» Р. Пукста, «Танец Анітры» Грыга, «Фіялкі» Д. Лукаса, —глядач адчуў майстэрства і сілу сімфанічнага гучання аркестра, цеплыню і ажурнасць яго музычных фарбаў.

Радуе, што за апошні час у самадзейных калектывах Гродзеншчыны нарадзілася многа новых твораў на сучасныя тэмы. Усё станоўчае, што было на аглядзе, дае падставу гаварыць, што ў параўнанні з першай дэкадай мы маем справу з якасна новым станам самадзейнага мастацтва.

Ул. ГАРАЧУН.

ГОРДАСЦЬ САВЕЦКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

ВЕЧАР У КАЛОННАЙ ЗАЛЕ ДОМА САЮЗАЎ, ПРЫСВЕЧАНЫ 80-ГОДДЗЮ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ ЯНКІ КУПАЛЫ І ЯКУБА КОЛАСА

Прыгожыя люстры струменяць яркае святло ў глядзельнай зале гэтага добра знаёмага масквічам і гасцям сталіцы цудоўнага будынка. На сцэне партэты двух чалавек. Многія з прысутных не раз бачылі іх у гэтай зале. Яны выступалі на вось гэтай трыбуне, куды цяпер падымаюцца адзін за адным літаратары братніх рэспублік, каб сказаць цёплае сардэчнае слова пра двух выдатных беларусаў, якія сталі гонарам усёй савецкай літаратуры.

У Калонную залу Дома Саюзаў сабраліся прадстаўнікі беларускага народа, выдатныя дзеячы рускай культуры, пасланцы іншых братніх народаў, прадстаўнікі шырокай маскоўскай грамадскасці.

Саюз пісьменнікаў СССР, Саюз пісьменнікаў БССР, Славянскі камітэт СССР і Міністэрства культуры БССР наладзілі тут вечар, прысвечаны 80-годдзю з дня нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа. Іх імёны стаяць побач з імёнамі вялікіх рускіх пісьменнікаў і паэтаў — Пушкіна і Кальцова, Някрасава і Гогаля, Талстога і Горкага. Творы Янкі Купалы і Якуба Коласа карыстаюцца агульнай народнай любоўю, сталі настольнымі кнігамі многіх савецкіх людзей.

У прэзідыуме ўрачыстага вечара займаюць месцы вядомыя савецкія літаратары — сакратары Саюза пісьменнікаў А. Суркоў, А. Твардоўскі, М. Грыбачоў, Г. Маркаў, П. Броўка, Г. Караваева, сястра Ул. Маякоўскага Л. Маякоўская, В. Ажаеў, работнікі маскоўскіх выдавецтваў, рэдактары часопісаў, газет, літаратары з краін народнай дэмакратыі, з братніх рэспублік, а таксама сын Якуба Коласа Д. Міцкевіч і пляменніца Янкі Купалы Я. Раманоўская.

На вечары прысутнічаюць першы сакратар ЦК КП Беларусі, кандыдат у члены Прэзідыума ЦК КПСС К. Т. Мазураў, старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР В. І. Казлоў, старшыня Савета Міністраў БССР Ц. Я. Кісялёў, сакратары ЦК КПБ Ф. А. Сурганаў, П. М. Машэраў, В. Ф. Шаура, Маршал Савецкага Саюза С. К. Цімашэнка і маршал авіяцыі С. А. Красоўскі — гарачыя прыхільнікі таленту Я. Коласа і Я. Купалы.

— Мы сабраліся сёння, — сказаў, адкрываючы вечар, Аляксей Суркоў, — каб аддаць даніну глыбокай пашаны светлай памяці двух выдатных сыноў беларускага народа, Ламаносавых беларускай паэзіі.

А. Суркоў гаворыць пра цесную сувязь Я. Купалы і Я. Коласа з вядомымі рускімі і ўкраінскімі паэтамі і пісьменнікамі. Да самых апошніх дзён свайго цудоўнага жыцця Я. Купала і Я. Колас аддана служылі сваёй творчасцю беларускаму народу. Іх літаратурны вопыт стаў добрай школай для цяперашняга пакалення беларускіх пісьменнікаў.

А. Суркоў дае слова Петрусю Броўку. Называючы святкаванне 80-годдзя з дня нараджэння вялікіх беларускіх паэтаў Я. Купалы і Я. Коласа вялікай падзеяй у жыцці ўсіх братніх народаў, П. Броўка ад імя беларускага народа з пачуццём глыбокай удзячнасці звяртаецца да грамадскасці, якая адзначае гэты выдатны юбілей. Я. Купала і Я. Колас выйшлі з самых глыбінь народных. Абодва нарадзіліся і выхаваліся ў простых сялянскіх сем'ях, абодва з самага маленства спазналі нялёгкую працу, гора, прыніжэнне народа і таму тэма народная, тэма барацьбы простых людзей за сваю долю праходзіць праз усю іх творчасць. Асабліва шырока раскрыўся талент Я. Купалы і Я. Коласа ў гады Савецкай улады, калі яны ствараюць свае самыя выдатныя творы. Паэзія Я. Купалы і Я. Коласа ярка адлюстроўвае мінулае, сучаснае і будучае беларускага народа. Маладому пакаленню беларускай літаратуры Я. Купала і Я. Колас заўсёды паказвалі прыклад мужнасці і сціпласці, праўдзівасці і пастаяннай сувязі з простымі людзьмі. Яны працавалі на славу народа, а не для асабістай славы. Шмат гадоў Я. Купала і Я. Колас былі пасланцамі свайго народа ў Вярхоўных Саветах СССР і БССР. Будучы акадэмікамі Акадэміі навук БССР, працавалі на навуковай ніве. Яны заўсёды былі непарыўна звязаны са сваёй зямлёй. Знаходзячыся ў гады Вялікай Айчыннай вайны ў братніх савецкіх рэспубліках, Я. Купала і Я. Колас сваім гнеўным пяром памагалі беларускаму народу ў яго змаганні з ворагам. Вялікае месца ў творчасці Я. Купалы і Я. Коласа займаюць творы аб братняй, непарыўнай дружбе народаў Савецкага Саюза.

Пасля прамовы П. Броўкі заслужаны артыст РСФСР Б. Цялегін прачытаў верш Я. Купалы «Заўсёды наперад!» у перакладзе Міхаіла Ісакоўскага.

Выступае ленінградскі паэт Аляксандр Пракоф'еў. Ён гаворыць, што ленінградская пісьменніцкая арганізацыя заўсёды была звязана з беларускімі паэтамі. Ленінградцы шмат папрацавалі над перакладамі твораў вялікіх беларускіх паэтаў. А. Пракоф'еў гаворыць пра тую вялікую ролю, якую адыгралі Я. Купала і Я. Колас у стварэнні і развіцці беларускай літаратуры.

Слова бярэ прадстаўнік братняй Польшчы Ян Гушча. «Заснавальнікі беларускай літаратуры Я. Купала і Я. Колас добра вядомы ў нас у краіне, — гаворыць ён. — Нашы паэты перакладаюць іх творы на польскую мову. Сёлета выйшаў зборнік вершаў Я. Купалы. Нядаўна ў Варшаве адбыўся ўрачысты сход прадстаўнікоў польскай інтэлігенцыі, прысвечаны светлай памяці Я. Купалы і Я. Коласа». Ян Гушча гаворыць пра цесную сувязь паміж пісьменнікамі і паэтамі Польшчы, Беларусі і Украіны. Імёны Я. Купалы і Я. Коласа не памруць у сэрцах тых людзей, якім дарагая дружба паміж нашымі братнімі народамі.

Выступае ўкраінскі пісьменнік А. Ільчанка.

— Два славянскія волаты — Я. Купала і Я. Колас сталі для беларускага народа такімі ж народнымі трыбунамі, якім быў для нас, украінцаў, Тарас Шаўчэнка. З іх рук беларускі народ атрымаў пераклады на беларускую мову Пушкіна, Шаўчэнкі, Някрасава, Міцкевіча. Я. Купала і Я. Колас усё жыццё правялі ў вялікіх клопатах аб дабрабыце, шчасці свайго народа. Мы схіляем галовы перад іх мужнасцю і талентам, — закончыў сваё выступленне А. Ільчанка.

Верш Я. Коласа «Лясам Беларусі» ў перакладзе П. Сямыніна прачытаў народны артыст СССР М. Цароў.

Ад літоўскай пісьменніцкай арганізацыі выступіў паэт Э. Матуазявічус.

— Мы ад душы радуемся і ганарымся разам з беларускім народам, што імёны Я. Купалы і Я. Коласа стаяць у першых радах савецкай паэзіі. У творах беларускіх і літоўскіх паэтаў мы сустракаем шмат агульнага. Некаторы час Я. Колас жыў у Вільнюсе. Творы Я. Купалы і Я. Коласа шырока вядомы аматарам паэзіі. Яны жылі з народам і будуць жыць разам з будучымі пакаленнямі, — сказаў у заключэнне Матуазявічус.

Узбекскі пісьменнік Р. Бабаджанаў гаворыць аб тым, што імёны Я. Купалы і Я. Коласа дарагія не толькі беларускаму народу, але ўсім савецкім людзям, у тым ліку і узбекам. Творы Я. Купалы і Я. Коласа вельмі любяць узбекскія чытачы. Я. Колас у гады другой сусветнай вайны жыў ва Узбекістане. Там у 1942 годзе грамадскасць адзначала дзень нараджэння паэта. Імёны Я. Купалы і Я. Коласа заўсёды будуць жыць у сэрцах і памяці узбекаў. У заключэнне Р. Бабаджанаў прачытаў верш Я. Коласа «Савецкая Беларусь» на узбекскай мове.

Потым выступіў Сяргей Гарадзецкі — адзін з першых перакладчыкаў Я. Купалы і Я. Коласа, добры знаўца іх творчасці.

Завяршаючы гэтую пераклічку братніх літаратур, выступае адзін з блізкіх сяброў Я. Коласа Максім Лужанін.

У заключэнне адбыўся

Беларускі мастак С. Гарус — аўтар шматлікіх графічных лістоў пра жыццё працоўных нашай рэспублікі. Яго работы неаднаразова паказваліся на ўсесаюзных і рэспубліканскіх выстаўках. Нядаўна мастак закончыў новую серыю лінагравюр на калгасныя тэмы.

Адну з іх — «Цялятніца» — мы змяшчаем.

ШЧАСЦЯ ТАБЕ, ПАЭТ!

У ЧАСЫ жорсткіх баёў з нямецка-фашысцкімі захопнікамі ўлетку 1942 года палявая пошта прынесла мне невялікую кніжку вершаў беларускіх паэтаў, выдадзеную ў Маскве. Сярод іншых у гэтай кніжцы былі змешчаны вершы Міхася Машары, з якімі я тады ўпершыню пазнаёміўся і палюбіў іх назаўсёды.

У паэзіі Міхася Машары шчасліва спалучаюцца мастацкая прастата, шчырасць і жыццёвая праўда — якасці, такія характэрныя для беларускай паэзіі. Чытаючы кніжкі паэта, пачынаючы ад тых радкоў, калі ён ішоў «з-пад стрэх саламяных», каб расказаць свету праўду простага працоўнага чалавека, і канчаючы вершамі сённяшніх дзён, — усюды бачыш вернасць гэтым паэтычным прынцыпам.

Міхась Машара прайшоў нялёгкі жыццёвы шлях. Сын беднага селяніна, ён нарадзіўся ў краі блакітных азёр, на цудоўнай Шаркаўшчыне, і не мог ва ўмовах царскага рэжыму атрымаць належнай адукацыі. Народнае вучылішча ў вёсцы Шкунцікі — вось яго універсітэт, які даў яму пуцёўку ў жыццё. З перамогай Савецкай улады паэт паступіў у адзіную працоўную савецкую школу, але грамадзянская вайна перапыніла гэтую вучобу. Юнак добраахвотна пайшоў у Чырвоную Армію, каб са зброяй у руках адстайваць заваёвы Кастрычніка ад замежных інтэрвентаў і ўнутранай контррэвалюцыі.

Паэту не прыйшлося карыстацца вынікамі перамогі. Шаркаўшчына, як і іншыя раёны былой Заходняй Беларусі, была адарвана ад Савецкай краіны, а сам паэт, трапіўшы ў акружэнне ў Аўгустоўскіх лясах, быў інтэрніраваны ў імперыялістычнай Германіі. Вярнуўшыся ў родныя мясціны, Міхась Машара звязваецца з падпольнай камуністычнай арганізацыяй і прымае актыўны ўдзел у рэвалюцыйным руху. Пазней ён становіцца афіцыйным рэдактарам прагрэсіўнай газеты «Наша воля». У хуткім часе паэт быў арыштаваны і тры з палавінаю гады прасядзеў у віленскай турме Лукішкі.

За турэмнымі кратамі Міхась Машара напісаў першыя вершы, і адтуль прыйшла яго паэзія да народа. Верныя сябры-падпольшчыкі вынеслі яго паэтычныя спытткі з Лукішак і выдалі асобнай кніжкай пад назвай «Малюнкі». Гэта было ў 1928 годзе. З таго часу Міхась Машара не спыняе творчай работы.

Пасля вызвалення з турмы паэт не мог знайсці ні працы, ні жаданага прытулку. Так цягнулася да верасня 1939 года.

У 1939 годзе на Усенародным сходзе ў Беластоку Міхась Машара як прадстаўнік народнай інтэлігенцыі выступіў з палымянай вершаванай прамовай аб уз'яднанні Беларусі ў адзінай сацыялістычнай дзяржаве, далучыўшы свой паэтычны голас да голасу народа.

У вершы «Прывітанне», напісаным у 1939 годзе, ён заяўляе:

Я горды тым,
што мне,
бяздомнаму паэту,
Радзімай стаў
увесь вялікі наш Саюз!

У гады Вялікай Айчыннай вайны Міхась Машара прымае актыўны ўдзел у партызанскім і франтавым друку, у перадачах Беларускага радыё, стварае хвалюючыя вершы пра гераізм і мужнасць савецкіх людзей у барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

Пасля вайны мне прыйшлося шмат падарожнічаць з Міхасём Машарам па Беларусі, наведваць гарады і вёскі, прадпрыемствы і калгасы. Пасля гэтых падарожжаў у Міхася Машары абавязкова з'яўляліся новыя вершы, прысвечаныя гераічнай працы нашага народа.

З вялікай радасцю сустракаюцца шматлікія чытачы са сваім паэтам. Яго вершы і паэмы карыстаюцца шырокай папулярнасцю не толькі ў Беларусі, але і ва ўсім Савецкім Саюзе. Яны перакладзены на многія мовы народаў СССР.

Шасцідзесяцігоддзе паэта супадае з трыццацігоддзем пачатку яго творчай дзейнасці. Хочацца пажадаць яму, таленавітаму паэту і шчыраму чалавеку, многіх гадоў жыцця і творчых поспехаў на карысць нашага савецкага народа.

Рыгор НЯХАЙ.

У сувязі з 60-годдзем з дня нараджэння Міхася Машары праўленне Саюза пісьменнікаў Беларусі паслала юбіляру віншаванне, у якім гаворыцца:

ДАРАГІ МІХАСЬ АНТОНАВІЧ!

Праўленне Саюза пісьменнікаў БССР, партыйная арганізацыя, усе Вашы сябры і таварышы па літаратурнай працы горача віншуюць Вас, нашага выдомага старэйшага паэта, паэта-змагара, з днём Вашага шасцідзесяцігоддзя.

Вы, дарагі Міхась Антонавіч, пачалі свой свядомы жыццёвы шлях чырвонаармейцам, які ўдзельнічаў у баях з белапалякамі, а творчую дзейнасць — у турме, як паэт-рэвалюцыянер. У жорсткія часы дыктатуры пілсудчыкаў Вы заклікалі да барацьбы за вызваленне Заходняй Беларусі з-пад прыгнёту паноў і буржуазіі. Вы спазналі тады горкую долю сына беднака, панскага парабка, турэмнага вязня і радасць змагара-камуніста, які аддаваў усе свае сілы і думкі рэвалюцыйнаму руху.

Пасля ўз'яднання Беларусі ў адной савецкай дзяржаве Вы, Міхась Антонавіч, і грамадскі дзеяч, і пясняр доўгачаканай свабоды, пясняр новага жыцця, сацыялістычнага будаўніцтва і дружбы народаў.

У суровыя гады Вялікай Айчыннай вайны Вы пішаце высокапатрыятычныя, мужныя вершы, якімі натхняеце савецкіх воінаў, народных мсціўцаў на вызваленне краіны ад фашысцкіх захопнікаў.

Кнігі, выдадзеныя Вамі, захапляюць чытача шчырым паэтычным словам.

Ваша творчасць у перакладзе на мовы брацкіх народаў стала здабыткам усёй шматнацыянальнай савецкай літаратуры.

У дзень Вашай слаўнай гадавіны з дня нараджэння, дарагі Міхась Антонавіч, прыміце гарачае, сардэчнае пажаданне Вам добрага здароўя і новых творчых перамог на карысць Радзімы, нашага народа.

У САЮЗЕ МАСТАКОЎ

ЦІКАВАЯ ТВОРЧАЯ РАЗМОВА

Месца мастака ў жыцці рэспублікі... Праблемы маралі і этыкі... Гэтым хвалюючым пытанням было прысвечана нядаўна адкрытае пасяджэнне партыйнага бюро Саюза мастакоў БССР. У ім прыняло ўдзел больш пяцідзесяці маладых майстроў, якія займаюцца жывапісам, скульптурай, дэкаратыўным мастацтвам. Уступнае слова сказаў сакратар партыйнай арганізацыі мастак А. Гугель.

Цікавыя былі выступленні жывапісцаў І. Ціханава, Н. Залознага, Л. Шчэмелева, якія падзяліліся творчым вопытам. Скульптар А. Анікейчык, які працуе над стварэннем галерэі вобразаў сучасніка, расказаў пра свае творчыя пошукі, пра цікавыя сустрэчы з перавафлянговымі сямігодкі.

На партыйным бюро ішла гарачая размова аб падрыхтоўцы да новай справаздачнай выстаўкі «Мастакі Беларусі ў 1962 годзе», што адкрыецца гэтымі днямі.

Карысныя былі для маладых майстроў мастацтва выступленні прадстаўнікоў старэйшага пакалення І. Ахрэмчыка, Л. Лейтмана, Я. Красоўскага, якія расказалі пра работу над сваімі палотнамі.

НОВАЕ ПАПАЎНЕННЕ

Мая Фёдараўна Рыбалкіна — паважаны чалавек на Віцебскай панчошна-трыкатажнай фабрыцы «КІМ». У 1952 годзе яна скончыла Маскоўскі тэкстыльны інстытут і атрымала кваліфікацыю мастака-афарміцеля. З таго часу яна працуе галоўным мастаком фабрыкі.

Цікавыя, арыгінальныя работы па афармленню трыкатажных вырабаў Маі Рыбалкінай не раз выстаўляліся ў Віцебску. Экспанаваліся яе малюнкі і на міжнародных выстаўках у Лейпцыгу, Рыо-дэ-Жанейра, Адыс-Абебе. Нядаўна серыя работ маладога мастака дэманстравалася на рэспубліканскай выстаўцы майстроў-афарміцеляў, занятых у лёгкай прамысловасці.

Мая Рыбалкіна прынята кандыдатам у члены Саюза мастакоў.

МАСТАКІ — СЕЛЬСКІМ КЛУБАМ

Перад намі дзесятак эскізаў, выкананых умелай рукой. Гэта фрагменты мастацкага афармлення клуба калгаса «Маяк камунізма» Барысаўскага раёна. Эскізы падрыхтаваў мастак М. Наумаў, які трымае цесную сувязь з калгасам. Хутка яны будуць ажыццёўлены. Калгас ужо выдзеліў сродкі на набыццё матэрыялаў. Мастак М. Наумаў на грамадскіх асновах будзе афармляць калгасны клуб. Сцены ўпрыгожаць беларускі арнамент і арыгінальны роспіс, які раскажа аб справах знатных людзей вёскі.

З добрага заўсёды баруць прыклад. На грамадскіх асновах будзе афармлены раённы Дом культуры ў Лагойску. Эскізы падрыхтаваў мастак І. Маслан.

Шэфствуючы над сельскімі клубамі, мастакі Мінска вырашылі аформіць яшчэ дзесяць клубных будынкаў.

ЦІКАВЫ ВОПЫТ

У магазін прыйшоў мастак... На гэты раз не купляць што-небудзь, а афармляць памяшканне.

Гаворка ідзе пра вялікі прамтаварны магазін, што на плошчы імя Калініна.

Праз некаторы час магазін адчыніць дзверы сваім пакупнікам. Ён узрадуе іх не толькі вялікім асартыментам тавараў, але і выдатным афармленнем сцен, столі, прылаўкаў, выкананым мастаком І. Эдэльманам і групай студэнтаў мастацкага вучылішча.

Макеты мастацкіх пано ў свой час абмяркоўваліся ў творчых секцыях і атрымалі высокую ацэнку.

У ПРЭЗІДЫУМЕ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ

Прэзідыум Саюза пісьменнікаў БССР абмеркаваў пытанне аб рабоце з маладымі. Вырашана правесці ў пачатку снежня ў Мінску творчы семінар маладых пісьменнікаў, якія працуюць у жанры сатыры і гумару. На семінар будуць запрошаны пачынаючыя літаратары з усіх абласцей рэспублікі.

Прэзідыум СП БССР вылучыў на атрыманне Ленінскай прэміі аповесць Васіля Быкава «Трэцяя ракета».

НАРАДА МАЛАДЫХ

Хутка ў Маскве адбудзецца Усесаюзная нарада маладых пісьменнікаў. Да яе рыхтуюцца маладыя празаікі, паэты і крытыкі нашай рэспублікі. Днямі ЦК ЛКСМБ і рэдакцыя часопіса «Маладосць» правялі нараду маладых пісьменнікаў сталіцы. Галоўны рэдактар часопіса «Маладосць» Пімен Панчанка зрабіў агляд твораў, надрукаваных у часопісе ў гэтым годзе. Творчасці маладых пісьменнікаў рэспублікі прысвяцілі выступленні А. Асіпенка, М. Ткачоў, Г. Бураўкін, І. Ласкоў, І. Пташнікаў, В. Адамчык, Б. Сачанка, М. Стральцоў, І. Чыгрынаў, Ул. Паўлаў. Аб праблемах сучаснай крытыкі гаварылі ў сваіх прамовах В. Каваленка, Ул. Юрэвіч, А. Яскевіч.

ЧЫТАЧЫ ШЧЫРА ДЗЯКУЮЦЬ

— Навучыўшыся чытаць і пісаць у сорак год,— гаворыць Варвара Уладзіміраўна Канавалава, — я з асаблівай сілай адчула і ацаніла вялікае значэнне кнігі для чалавека. Мне стала зразумела, як шмат траціць той, хто не чытае кніг.

Варвара Уладзіміраўна арганізавала ў сябе дома бібліятэку на грамадскіх асновах. Бібліятэка абслугоўвае пяць населечых пунктаў Віцебскага раёна, у якіх цяпер кнігу чытае кожны пісьменны.

Актыўнымі чытачамі бібліятэкі з'яўляюцца: рабочы В. Станкавенка, экскаватаршчык К. Каралін, пенсіянер Г. Антоненка Бібліятэка працуе толькі год, а ўжо стала папулярнай, яна мае 400 чытачоў.

У Варвары Уладзіміраўны ёсць добрыя памочнікі. Гэта вучаніцы-піянеркі Г. Антоненка, А. Шышкова, А. Сакалова, Т. Арлова.

Чытачы шчыра дзякуюць Варвары Уладзіміраўне.

О. НОТКІНА,
метадыст абласной бібліятэкі імя Ул. І. Леніна.
г. Віцебск.

Перакліч эпох

Улічаны, здаецца, і парады таварышаў, і слушныя заўвагі рэцэнзентаў. Пасля ўсіх неабходных перапрацовак і правак у апошні раз вычытваю тэкст свайго зборніка літаратурна-крытычных артыкулаў «Герой і сучаснасць». Цяпер можна здаць кнігу ў выдавецтва.

Літаратура наша развіваецца надзвычай імкліва і крытык, вядома, не можа абніяць неабдымнае. У сваёй кнізе я і не імкнуся да гэтага, а разглядаю толькі пэўную частку напісаных беларускімі празаікамі за апошнія некалькі год твораў. Цікавіць мяне пераважна такая праблема: сучасны жыццёвы матэрыял і сучасны падыход да яго мастацкага асваення. З гэтага пункту гледжання і яду размову аб многіх нарысах, апавяданнях, раманах, якія мне здаюцца цікавымі.

Прапаную ўвазе чытачоў урывак з кнігі.

Аўтар.

Барацьба за новага чалавека — гэта, здаецца, самае галоўнае ў нашай літаратуры. Яна пачалася не сёння і не ўчора, яна мае сваю гісторыю, свае традыцыі, свой арсенал праверанных сродкаў, якія з дня на дзень удасканальваюцца ў адпаведнасці з новымі запатрабаваннямі часу. І нельга адмаўляць ролю мастацкіх сродкаў уздзеяння на чытача толькі таму, што яны адкрыты і выпрабаваны ўчора, а не сёння. Найлепшы, на нашу думку, доказ гэтаму — раман Івана Мележа «Людзі на балоце».

Аўтар не забывае такой акалічнасці: рэвалюцыяй быў выкліканы да жыцця даволі пашыраны тып рамантыка-летуценніка, якому здавалася, што калі не заўтра, то паслязаўтра абавязкова пачнецца сусветная рэвалюцыя і ён паедзе ў Грэнаду ці яшчэ куды-небудзь, каб разам з працоўнымі душыць там «контру», дзяліць зямлю, наводзіць справядлівыя парадкі. Рамантыка працоўных будняў для некаторых такіх людзей была закрытай кнігай.

У адрозненне ад героя рамана, былога чырвонаармейца Міканора, які стаў першым у сваёй вёсцы актыўным прапагандыстам новых ідэй і рэалістычна падыходзіў да запатрабаванняў часу мы сустракаемся ў кнізе і з вобразам начальніка міліцыі Харчава, які зусім інакш разумеў сваю задачу. Былы ўдзельнік чырвонагвардзейскіх атак, Харчаў і ў мірных умовах гатовы секчы з пляча, не вельмі задумваючыся над розніцай паміж звычайнай чалавечай слабасцю і адступніцтвам, здрадай. Усіх людзей ён дзяліў толькі на дзве катэгорыі: або — паплечнік, або — вораг. Харчаў нават не здагадваўся, што многім і многім людзям, каб стаць паплечнікамі, трэба прайсці вялікую жыццёвую школу. Ці не ў тым была трагедыя начальніка міліцыі, што ён, пры ўсёй сваёй адданасці Савецкай уладзе, не разумеў яе выхаваўчай ролі. З вышкі, на якую ўсе мы ўзняліся ў нашы дні, Іван Мележ вельмі добра разглядзеў тое, што было яшчэ недаступна пісьменнікам на ранейшых этапах беларускай савецкай літаратуры. Ці не з Харчавых выраслі ў перыяд культу асобы Сталіна тыя перастрахоўшчыкі, якія прынеслі надзвычай многа шкоды народу і краіне?

У вобразе Харчава няма той аднабаковасці, пры якой сацыяльная функцыя чалавека адмяжоўваецца ад усяго індывідуальнага ў яго характары і паводзінах, у яго псіхалогіі. Харчаў раскрываецца ў разнастайных сувязях з іншымі людзьмі, захоўваючы пры гэтым сваю самабытнасць.

Вось ён у рэдкую хвіліну адпачынку сядзіць дома каля ўслона босы, у галіфэ з леямі і прапаленай на локці сарочцы. Мокрымі рукамі, аблепленымі луской, чысціць ён рыбу і ўвесь аддаецца такому нязвыкламу занятку. Ён абавязкова пакрыўдзіцца, калі вы нават падумаеце, што рыбу яму падарылі: «Эге, падарылі! Так я і вазьму!..»

Вы гатовы на нейкі момант забыць, што перад вамі — начальнік міліцыі, у якога, мабыць, у той жа самы дзень страляілі бандыты, бо, здаецца, мірам і спакоем прасякнута кожнае слова Харчава, калі ён гаворыць аб той жа рыбе.

Але мірнае жыццё паклала свой адбітак на адным толькі вонкавым абліччы Харчава. Няхай сабе ён падабрэў тварам, малаватай зрабілася гімнасцёрка, але душой гэта быў ранейшы кавалерыст-рубака, герой імклівых атак, які ведаў, як ставіцца да ворага ў адкрытых баях. Ну, а ў новых умовах, калі з ворагам трэба весці бяскроўную класавую барацьбу ў галіне, скажам, эканомікі, ідэалогіі і арэнай баёў становяцца душы людзей, іх свядомасць? Да гэтага Харчаў не гатовы, бо глядзеў не ўперад, а назад, жыў успамінамі пра мінулае і не разумеў, што рэвалюцыя здзейснена менавіта для таго, каб перайначыць жыццё ўсіх людзей працы, нават тых, што, падобна да Васіля Дзятліка, сёння яшчэ не расталіся з мінулым.

Прыгадаем спрэчку за Васіля Дзятліка паміж начальнікам міліцыі і старшынёй валвыканкома. Малады вясковы хлопец пад пагрозай неадкладнай расправы паказаў бандытам, дзе жыве адзін з мясцовых актывістаў. Ніякага іншага дачынення да бандытаў Васіль Дзятлік не меў і трымаць яго ў турме не было падстаў. Харчаў упэнеўны, што «ўсе яны» хітруюць і выдаюць сябе за невінаватых. На пытанне, што значыць «усе», ён адказвае: «усе... каторыя трапляюцца!..»

Апейка спрачаецца з начальнікам міліцыі і гаворыць яму: «Што мы за такая савецкая ўлада, калі нас свае баяцца павінны?» Адзін бачыў у Васілю Дзятліку, і не толькі ў ім, патэнцыяльнага хаўрусніка бандытаў, якога на ўсякі выпадак варта пакараць. Другі зазірнуў у самую душу сялянскага хлопца і зразумеў, што з гэтага трапяткога юнака можна выхаваць добрага чалавека.

Адкуль у Васіля бралася недаверлівасць да ўсяго новага, дзе яе вытокі? Каб адказаць на гэта пытанне, трэба прыгадаць аднаасобную вёску дваццатых гадоў. Васіль і яго суседзі жылі ў сваіх Куранях, нібы на тым востраве сярод балот. З навакольным светам іх звязвалі намошчаныя па дрыгве дарожкі, карыстацца якімі можна было толькі зімою ці хіба ў спякотнае лета, калі твань перасыхала. Куранёўцы бадай што не адчувалі сябе неад'емнай часткай усяе краіны, дзе адбываліся найвялікшыя пераўтварэнні. Яны лічылі, што ўсё, даступнае іншым людзям, недасягальна для іх. Адгэтуль і недавер да ўсяго новага, нязведанага, яшчэ не праверанага асабістым вопытам. Тутэйшы чалавек, паляшук, былы настаўнік Апейка, прыглядаючыся да куранёўцаў і іх жыцця, не першы раз бачыў: «На добрую, карысную для сябе справу людзі не хацелі даваць згоды. Не хацелі, ён ведаў, часткова таму, што яна парушала спакой, звыклы, надзейны, цягнула лішнія клопаты і невядомасць. Але гэтаму нехаценню была і іншая прычына: так ужо вялося — усякая новая справа выклікала тайнае ці яўнае недавер'е. Нібы загадзя вядома было, што нехта на гэтым добрым неяк выйграць мяркуе, нехта іншы, а не яны...»

Васіль Дзятлік — дзіця свайго часу і свайго асяроддзя. Нянавісць да кулакоў спалучаецца ў Васіля з нейкай зайздрасцю да іх. Дайце яму такую магчымасць, і Васіль сам абрасце гаспадаркай не горш за мясцовага багацея Глушака. Перараздмерковаць зямлю, абмежаваць Глушака ён хоча не для таго, каб падарваць эканамічную моц кулацтва, а каб і самому наблізіцца да багацця: «Пачакайце, прыйдзе час — пабачыце, хто такі ён, Дзяцел Васіль! Пабачыце, усё пабачыце! Будзе гэта! Будзе яго пара!.. Ён узнімецца, пабачыце!.. Гумно снапамі наб'е! Кароў завядзе! Не адну — тры, пяць! Стаенніка завядзе! Такога, што Корч пазелянее ад злосці!.. Толькі б перадзел зрабілі!»

У гэтай цёмнай душы, знявечанай раннім сіроцтвам, нягодамі, матэрыяльнымі нястачамі, ёсць аднак і прасветліны, цепліцца няхай сабе і няяркі агеньчык, які можа разгарэцца ў вялікае полымя. Патрэбны толькі спрыяльныя ўмовы. Я маю на ўвазе ні з чым не параўнаную любоў Васіля да зямлі. Прыйдзе час, і ён зразумее, як трэба па-сапраўднаму гаспадарыць на зямлі, каб яна прыносіла шчасце і радасць усім людзям працы, усяму народу. Толькі тады ўлада зямлі, што адвечна гняла аднаасобніка, зменіцца ўладай хлебароба-калектывіста над ператворанай яго рукамі прыродай.

Нават кахаць па-сапраўднаму Васілю перашкаджае яго закаранелы індывідуалізм, раскрыты пісьменнікам з бязлітаснай праўдзівасцю. Малады чалавек церпіць паражэнне не толькі таму, што ў кулацкага сына Яўхіма Глушака больш козыраў у руках, каб прывабіць дзяўчыну з беднай сям'і. Такія канфлікты сустракаліся нам у літаратуры дзесяткі разоў. А ў дадзеным выпадку верх бярэ зусім не багацце, на якое Ганна ніколі не паквапілася б, калі б Васіль быў іншым чалавекам і не прымешваў да паэзіі кахання самую чэрствую прозу.

Пачнём з паэзіі. Быў дзіўны вечар, была непаўторная летняя ноч, калі ўсё, што Васіль бачыў, было дзіўна сагрэта Ганнінай блізкасцю, «нечым цёплым, невыказным, незразумелым, што паявілася ў гэты вечар, што бянтэжыла яго і ад чаго аж млелі перапоўненыя радасным чаканнем грудзі».

Многа было пасля гэтага радасных, незабыўных сустрэч, чыстай і светлай паэзіі, шчырых парыванняў. Але кропля за кропляй, з самых патаемных глыбінь Васілёвай душы прасоўвалася проза з яе карыслівымі разлікамі, будзённішчынай, палахлівасцю перад заўтрашнім днём, недавер'ем да сябе і да самага блізкага чалавека. Гэтае недавер'е, наперакор усяму, змусіла Васіля адвярнуцца, калі Ганна не збаялася злых языкоў і ў роспачы кінулася да яго, заарыштаванага міліцыянерам і ўзятага пад канвой. Варта было некаму пусціць чутку, што ў Ганны нешта было з Яўхімам, і Васіль паверыў не ёй, а плеткарам. Гэта ўжо не толькі рэўнасць, а ўсё тая ж насцярожанасць да людзей, упэўненасць у тым, што кожны гатовы цябе ашукаць. І самае галоўнае: больш за каханне Васілю патрэбны багаты пасаг. «Усё адно яна мне не пара!.. Толькі і дабра таго, што як прытулішся, бывала, сэрца соладка ные і гатоў на ўсё забыцца!.. А хіба ж, будучы сам-насам, цвярозы, не думаў я, што не пара яна, што толку з яе мала? Хіба ж не думаў, што лепей бы да багацейшай якой!».

Так раскрываецца перад намі гэты чалавечы характар, раскрываецца ў сваім нялёгкім станаўленні, у сваёй супярэчлівасці, сваіх сутычках з не менш каларытнымі характарамі Ганны, Яўхіма ў сваіх дачыненнях з многімі іншымі людзьмі, якія так ці інакш уплывалі на Васіля. Некаторыя з гэтых уплываў прынцыпова важны для разумення ўсёй канцэпцыі рамана. Што было б, калі б на жыццёвым шляху Васіля з яго ўнурыстасцю, недавер'ем да іншых людзей сустракаліся адны толькі Харчавы? Але такой анамаліі і не магло быць. Харчавы — не правіла, а выключэнне: ні ў дваццатых гадах, ні пазней апошняе слова было не за імі. Вось і ў дадзеным выпадку, як мы ўжо гаварылі, першы промень святла пранікае ў цёмную душу юнака, калі ён слухае хоць і суровыя, але праўдзівыя і, галоўнае, добразычлівыя словы Апейкі. Яшчэ больш ўплыў меў на Васіля былы армеец Міканор, бо з ім, як з суседам, даводзілася сустракацца штодзённа. А Міканор быў не абы-хто, а першы ў сваёй вёсцы камсамолец, першы чалавек, які атрымліваў газету, першы з маладых людзей, хто пабачыў свет і пераканаўся, што калектыўнымі намаганнямі можна і з балотам справіцца і ўсё жыццё перайначыць.

Было б няпраўдай, ігнараваннем усёй логікі характару Васіля, калі б пісьменнік напісаў, што малады Дзятлік адразу паверыў у шчырасць Міканора і пайшоў за ім насустрач новаму жыццю. Ад такой спрошчанасці Іван Мележ далёкі. Васіль застаецца верным сабе, калі на сходзе разам з усімі згаджаецца будаваць грэблю праз балота, а сам думае, што гэта пустая гаворка і ніколі куранёўцы не зойдуцца практычна такой нязвыклай справай. Зусім зразумела і тое, што ён і з месца не скрануўся, пакуль не ўбачыў, што на грэблі ўжо завіхаюцца іншыя людзі, яго суседзі.

Хоць і не па добрай волі, а чалавек зрабіў крок наперад, першы раз у жыцці прыняў асабісты ўдзел у агульнай, грамадскай справе, не разлічваючы атрымаць за гэта што-небудзь непасрэдна сабе. Васіль не мог не ацаніць бескарыслівасці таго ж Міканора, гатовага аддаць усё, нават і жыццё, каб лепш стала жыць усім людзям, усяму народу.

Такіх людзей, як Васіль Дзятлік, у дваццатых гадах былі мільёны. Для іх была здзейснена рэвалюцыя, аб іх думаў Ленін у сваім геніяльным кааператыўным плане. Не маглі мільёны людзей на другі дзень пасля рэвалюцыі адразу вызваліцца ад старых перажыткаў, якія перадаваліся ім з пакалення ў пакаленне. І нельга было з гэтым не лічыцца ў барацьбе за новага чалавека. Успомніце бурлівы сход куранёўцаў, на якім упершыню практычна ставілася пытанне аб неабходнасці будаваць грэблю. Трэба быць вельмі добрым знаўцам чалавечай душы, каб так тонка, як гэта ўдалося І. Мележу, перадаць і адчуванні асобных людзей, і калектыўны настрой:

— Дык хіба мы супроць? Мы ж толькі пра тое, што нам ето не пад сілу?

— Перарвемся, а не зробім!.. Коней замучым, і толькі!

— От каб уласць узялася!

У гэтым шумным хоры вылучаецца пакуль што толькі голас Міканора:

— От не люблю ето, наша плаканне! Ну, проста — слухаць неахвота! Шчэ і за сякеру не ўзяліся, а ўжэ стогнем — спіна баліць!

Заставалася абвергнуць самы галоўны тэзіс апанента:

— Адзін будзе надрывацца, а другі на мураве качацца!..

Тут якраз Міканор праз сваю неспрактыкаванасць дапусціў грубую памылку тактычнага парадку. Ён забыў, што нельга адразу лезці з праграмай-максімум, пакуль людзі да яе не падрыхтаваны: «У другіх сёлах, не сакрэт, — унь ужэ даўно за балоты ўзяліся, асушаць пачалі.— Не чэшуць патыліцу, а капаюць канавы і робяць лугі. І каноплі і ўсякія іншыя культуры сеюць! А ў нас — як бы і няма балота? Як бы ў нас лішне зямлі?»

Аўтар не забыў, што на сходзе прысутнічаў і Васіль Дзятлік. Да пэўнага часу хлопец трымаўся нейтральна. А пасля слоў Міканора пра балота ўстрапянуўся і ён: «От жа ўлезла чалавеку ў галаву дурасць, не дае збыту. Як бы ето проста так — пайшоў і асушыў, нямаведамо з чым і кім, такую прорву бесканечную навокал! — У другіх сёлах, кажа... У другіх — усюды рай, сам хлеб сеецца, сам мелецца, самі булкі ў рот ляцяць, а мы — без хлеба ад зімы! Балбоча як бы рабіць няма чаго!»

Васіль не мог пры гэтым не падумаць і аб сваёй выгодзе, інакш ён здрадзіў бы свайму характару: «Калі б казна ўзялася да правіла якую капейчыну, то можна было б і ўзяцца вольным часам».

Цікава, што і сам Міканор, «зачапіўшы гаворкай асушку балот і сам адразу ж пачуў, што схібіў — усё роўна ніхто не падтрымае...»

Пры такім майстэрстве індывідуальных і калектыўных характарыстык аўтар смела мог спадзявацца, што з логікі развіцця вобразаў, з падтэксту чытач уловіць і агульную думку, агульную канцэпцыю рамана, і тыя правільныя вывады, якія ненавязчыва, але настойліва просяцца са старонак рамана.

Тое, што Івану Мележу ўдалося сказаць новае, сваё слова пра беларускую вёску дваццатых гадоў, адкрывае раману шырокую дарогу да сэрца нашага сучасніка, які зацікаўлены ў поўным выкаранені ўсіх рэцыдываў уласніцтва, індывідуалізму, што так моцна трымалі ў сваіх кіпцюрах Васіля Дзятліка і многіх людзей аднаго з ім лёсу.

Я. ГЕРЦОВІЧ.

ЗНАХОДКІ АДНОЙ ЭКСПЕДЫЦЫІ

Там, дзе цяпер раскінуліся палеткі мядзельскіх калгасаў, 900 гадоў назад праходзіла мяжа плямёнаў крывічоў і літоўцаў. З тых далёкіх часоў не захавалася нават і рэшткаў паселішча. Не дайшлі да нас легенды і паданні аб жыцці далёкіх продкаў. Але затое гады зберагліся старажытныя курганы, што сустракаюцца ў лясах Мядзельшчыны.

Больш дваццаці курганоў было насыпана славянамі ў тыя далёкія гады каля вёсці Навасёлкі, за тры кіламетры ад Мядзеля. Для археолагаў не з'яўлялася таямніцай, што гэтыя курганы — месца пахавання далёкіх продкаў. Толькі да іх, да курганоў, як кажуць, не даходзіла чарга. А месяц назад яны прыцягнулі ўвагу работнікаў Дзяржаўнага гісторыка-краязнаўчага музея.

Вось да аднаго, самага высокага, чатырохметровага, прыйшлі людзі з рыдлёўкамі. Не, яны не капалі курган. Яны разбіралі яго ў поўным сэнсе слова па жменьках, абмацваючы кожны камячок зямлі. Перабралі па жменьках можа тры, можа чатыры тоны. І — ніякіх вынікаў. Што ж, такі лёс некаторых раскопак. Удзельнікі экспедыцыі выказалі думку, што ў свой час курган быў абкрадзены грабежнікамі, якія шукалі тут скарб.

Але вось раскопкі другога кургана прынеслі плённыя вынікі. На ўзроўні зямлі выяўлены астанкі пахаванага воіна. Побач з імі з правага боку — кап'ё. Каля пояса — нож, бронзавая спражачка. Каля галавы — наждачны каменьчык. Яго клалі для таго, каб воін мог вастрыць кап'ё і нож. Каля ног знойдзены гліняны збанок, які вельмі добра захаваўся. На збанку — кляймо майстра. Паводле меркаванняў адных археолагаў, у такія збаны клалі ежу. Другія сцвярджаюць, што налівалі ваду. Пакуль што гэтага не высветлена. Раскопкі выявілі многія дэталі абраду старажытнага пахавання. Быў знойдзены невялікі пласт чорнай зямлі. Больш уважлівае даследаванне паказала, што гэта рэшткі вогнішчаў, якія раскладваліся вакол нябожчыка, на месцы будучага кургана. Такі абрад пахавання ўжываўся ў IX—X стагоддзях.

Час пахавання пацвердзіла яшчэ адна падрабязнасць. У наступным кургане была знойдзена жаночая магіла. Там не было зброі, затое былі дробныя шкляныя пацеркі, велічынёю прыкладна з галоўку шпількі і большыя — з гарошыну, на якіх захаваліся ўзоры. Вядома, што крывічы, якія жылі ў краі лясоў і балот, не ведалі, як варыць шкло. Ёсць весткі, што з балотнай руды яны выплаўлялі жалеза і выраблялі сякеры. Аднак пацеркі маглі трапіць да мясцовых жыхароў у выніку гандлю. Гэта пацвердзіла другая знаходка. У адным з жаночых курганаў знойдзена аздоба — падвеска. Яе ачысцілі ад зямлі і здзівіліся — гэта была срэбраная арабская манета чаканкі X стагоддзя.

Пад кіраўніцтвам удзельнікаў экспедыцыі Р. Самсонава, Н. Варатніцкай і І. Цюрынай было раскапана восем курганоў. У музей прывезены багатыя экспанаты: жалезныя баявыя сякеры, коп'і, нажы, пярсцёнкі, срэбраныя бранзалеты, гліняныя збаны, бронзавыя спражкі, пацеркі. Кіраўнік экспедыцыі Р. Самсонаў расказвае:

— Гэта першая самастойная экспедыцыя Гісторыка-краязнаўчага музея. Як бачыце, яна прайшла паспяхова. Знаходкі сведчаць аб матэрыяльнай культуры старажытных славян, якія жылі на тэрыторыі нашай рэспублікі. Знойдзеныя рэчы будуць апрацаваны і ў недалёкай будучыні складуць экспазіцыю музея. Вас цікавяць нашы далейшыя планы? Магу паведаміць, што ў наступным годзе кы правядзём археалагічныя экспедыцыі на Магілёўшчыне і Гомельшчыне.

І. ГАРПЕНІК.

Вось яны, пацеркі, якія насілі прыгажуні X стагоддзя.
Фота Ул. КРУКА.

Літаратура і мастацтва — Кансультацыя

У рэдакцыю прыйшло пісьмо з Калінкавіцкага раёна.

— Ці могуць школы вылучаць творы мастацкай літаратуры на конкурс для атрымання Ленінскіх прэмій? — пытаецца дырэктар Крукавіцкай васьмігадовай школы В. Саковіч.

Яму адказвае па нашай просьбе член Камітэта па Ленінскіх прэміях у галіне літаратуры і мастацтва пры Савеце Міністраў СССР народны артыст СССР Б. Платонаў.

— На атрыманне Ленінскіх прэмій 1963 года могуць вылучацца творы літаратуры, мастацтва, журналістыкі і публіцыстыкі, надрукаваныя, публічна паказаныя ці выкананыя не пазней 15 чэрвеня 1962 года. Высокая ідэйна-мастацкая якасць твора, шырокае грамадскае прызнанне яго — вось крытэрый пры вылучэнні кандыдатур.

Прадстаўленне работ робіцца праўленнямі саюзаў пісьменнікаў, журналістаў, кампазітараў, мастакоў, работнікаў кінематаграфіі, прэзідыумам ВЦСПС, калегіямі міністэрстваў СССР і саюзных рэспублік, Акадэміяй мастацтваў СССР, рэспубліканскімі тэатральнымі таварыствамі, навукова-даследчымі інстытутамі, вышэйшымі навучальнымі ўстановамі, рэдкалегіямі газет і часопісаў, сходамі працоўных.

Настаўнікі адной ці некалькіх школ, як і калектыў любой установы ці арганізацыі, на сваім агульным сходзе могуць абмеркаваць і вылучыць мастацкі твор на конкурс для атрымання Ленінскай прэміі.

Свае прапановы аб прысуджэнні Ленінскіх прэмій, водгукі аб прадстаўленых работах трэба пасылаць па адрасу: Масква, І-51, Нягліная вул., 15, Камітэт па Ленінскіх прэміях у галіне літаратуры і мастацтва пры Савеце Міністраў СССР.

ПРА МАЛОДШАГА СЯБРА

ЛЁГКА, АЛЕ НЕ СПРОШЧАНА!

Праца эстраднага артыста мае сваю спецыфіку і, безумоўна, свае цяжкасці. Знайсці новых здольных выканаўцаў для эстрады не так проста. Мы гэта ведаем з вопыту нашай філармоніі. Вельмі правільна, што яе кіраўніцтва за апошні час усё часцей шукае свежыя выканаўчыя сілы сярод лепшых прадстаўнікоў мастацкай самадзейнасці, прыцягваючы іх да работы на прафесіянальнай сцэне.

Летась на адным з канцэртаў мастацкай самадзейнасці ў Мінску нам давялося бачыць выступленне двух маладых людзей, якія вельмі жыва і непасрэдна запаўнялі паўзы паміж канцэртнымі нумарамі. Гэта быў парны канферанс, дарэчы, найбольш цяжкі і часам не вельмі ўдзячны жанр на эстрадзе. Адзін з артыстаў-аматараў — цыбаты брунет — меў крыху сумны выгляд у той час, як яго партнёр, бландзін невялікага росту, быў рухавы, тэмпераментны і напорысты.

Пасля канцэрта мы пазнаёміліся.

— Анатоль Бондар, механік Мінскай фабрыкі імя Калініна, — адрэкамендаваўся бландзін.

— Ну, а я — рабочы той жа фабрыкі, Карл Коцін, — ганарыста прабасіў чарнявы.

Розны выгляд, розныя натуры людзей... А збліжае іх адно: вялікая любоў да эстраднага мастацтва і пастаяннае жаданне ўдзельнічаць у мастацкай самадзейнасці менавіта ў гэтым жанры.

— А чаму б вам не паспрабаваць свае сілы на прафесіянальнай сцэне! — па-сяброўску прапанавалі мы маладым хлопцам.

Яны некаторы час вагаліся, а потым згадзіліся. Так былыя ўдзельнікі мастацкай самадзейнасці Мінскага Палаца культуры прафсаюзаў А. Бондар і К. Коцін сталі артыстамі Беларускай філармоніі. Пачаліся бясконцыя рэпетыцыі з рэжысёрам, балетмайстрам, якія цярпліва і настойліва дамагаліся ад малодых, яшчэ нявопытных выканаўцаў выразнай фразы ці танцавальнага «па». Канферансье ж павінен дасканала валодаць не толькі сцэнічнай мовай, але і быць надзвычай рухавым, асабліва калі нумар звязаны з пэўнымі прытанцоўкамі.

У час рэпетыцый К. Коцін іншы раз гаварыў свайму сябру:

— Бадай, на фабрыцы мы менш поту пралівалі і менш стамляліся, чым на сцэне. Хіба не праўда, Толя?

Так нарадзілася ў маладых эстрадных выканаўцаў першая сцэнка-фельетон В. Дыхавічнага і М. Слабадскога — «Вытворчая любоў», а следам за ёю паявілася яшчэ некалькі сатырычных інтэрмедый, якія выконваюцца на беларускай мове.

Калі ж на афішах упершыню паявілася: «Праграму вядуць Карл Коцін і Анатоль Бондар» — гэта выклікала ў маладых артыстаў пачуццё законнага гонару за сваю новую прафесію і разам з тым пачуццё вялікай адказнасці за кожнае выступленне перад шырокай публікай. Бо пасля кіно, эстрада — самае масавае і любімае мастацтва. Артыст эстрады здольны выступаць не толькі ў ярка асветленай канцэртнай зале, але і ў цэху завода, сярод рыштаванняў новабудоўляў, на палявым стане ці ў вайсковым падраздзяленні. На долю эстрадных артыстаў, напрыклад, у нашай філармоніі прыпадае выкананне трох чвэртак усяго фінансава-вытворчага плана. Чатыры тысячы канцэртаў — такі ў нас штогодні вынік дзейнасці выканаўцаў гэтага баявога, актуальнага жанра. І вось у гэтых шматлікіх канцэртах ўдзельнічае маладая пара вядучых — А. Бондар і К. Коцін.

Мінулі дні і месяцы і прафесіянальнае ў творчасці маладых усё больш пачынала пераважаць над аматарскім.

Мастацтва эстрады, якому ўласцівыя і гераічны маналог, і вельмі дасціпная частушка, і тэмпераментны танец, і лірычная песня, і нават тайны «знікнення і паяўлення» рэчаў у руках майстроў-фокуснікаў сапраўды захапіла артыстаў. Хутка ў іх паявіліся новыя работы: інтэрмедыя В. Ардава і С. Кантара — «Танец па інструкцыі», сатырычныя куплеты М. Гелера «Гэта замежнае», «Усходняя песенька пра заходнія справы» і, нарэшце, даволі складаны купалетны фельетон «Сучасныя танцы» з эстраднай праграмы «Кляксы» В. Дыхавічнага і М. Слабадскога. Трэба бачыць, як высмейваюць А. Бондар і К. Коцін у гэтым фельетоне так званых «адказных работнікаў»,

якія, праваліўшыся на адной рабоце, бясконца перамяшчаюцца на іншыя, «цёплыя» месцы.

Для гэтай пары вядучых характэрна непасрэднае і вельмі жыццярадаснае раскрыццё драматургічнага матэрыялу малых форм. Маладыя артысты дасткова рухавыя (яны нядрэнна танцуюць і нават... спяваюць), яны прывабныя і сціплыя на эстрадзе.

Аднак бываюць выпадкі, калі А. Бондар і К. Коцін выступаюць з творамі нізкай мастацкай якасці. Навошта, напрыклад, спатрэбілася ўключаць у адну з канцэртных праграм нізкапробныя, беззмястоўныя частушкі з прэтэнцыёзнай назвай «Частушкі пра чыкушку», у якіх ёсць такія літаратурныя «перлы»:

В гастрономе мы сложились,
Четверо по рублю семьи
В результате получилось —
По пятнадцать суток всем (?!)

Смех — патрэбная і вострая зброя, і ў арсенале эстраднага мастацтва ён адыгрывае важную ролю. Але трэба памятаць пра тое, што папулярнасць артыста савецкай эстрады дасягаецца не пустымі частушкамі «ўвогуле» дзеля смеху і не пагоняй за танным поспехам у некаторай непатрабавальнай часткі публікі, не воплескамі, а ідэйнай, баявой мэтанакіраванасцю ўсяго выступлення. Вось чаму хочацца перасцерагчы пачынаючых артыстаў ад захаплення легкаважным, забаўным, безыдэйным рэпертуарам, што іншы раз яшчэ трапляецца ў іх практыцы. На эстрадзе ўсё павінна быць лёгкае, але не легкаважнае.

І яшчэ. У сцэнках-інтэрмедыях падзеі вельмі шпаркія і, часцей за ўсё, развіваюцца літаральна на працягу дзвюх-трох мінут. Таму тут усё павінна быць добра адточаным і яркім. Яны патрабуюць ад артыста эстрады асабліва выразных сродкаў, надзвычай глыбокага раскрыцця вобразаў, характараў сваіх «герояў», карацей кажучы, патрабуюць ад выканаўцы вялікага сцэнічнага майстэрства. І вось тут, на жаль, нашы маладыя артысты К. Коцін і А. Бондар нярэдка збіваюцца з правільных пазіцый. З прычыны сваёй нявопытнасці, не валодаючы яшчэ дастатковым майстэрствам, яны часам трапляюць у палон хоць і прывабнаэфектнага, але толькі вонкавага, павярхоўнага вырашэння тэмы. Асабліва гэта прыкметна ў інтэрмедыі «Танец па інструкцыі», дзе артысты, захопленыя танцавальнымі «антраша», прапусцілі галоўнае: яе вострую сатырычную мэтанакіраванасць. Таму тут на першы план выступіла самалюбаванне: «Паглядзіце, маўляў, як мы па-заліхвацку вытанцоўваем», а асноўнае, дзеля чаго, уласна, напісана інтэрмедыя, адышло на другі план.

Усё гэта тлумачыцца толькі адсутнасцю вопыту і высокага майстэрства і можна паправіць, бо майстэрства, як вядома, прыходзіць з цягам часу...

Мінуў год працы на прафесіянальнай сцэне маладых выканаўцаў А. Бондара і К. Коціна. Гэта ўжо дасягатковы тэрмін для першай праверкі сіл, але яшчэ малы для набыцця свайго асабістага творчага аблічча, свайго «почырку». Толькі штодзённая ўпартая праца і мастацкія пошукі могуць прынесці артыстам і заслужаны поспех і пэўнае майстэрства.

Маладыя акцёры жывуць новымі мастацкімі задумамі. Яны працуюць над маладзёжнай эстраднай праграмай пад умоўнай назвай «Вясёлая ракета», рыхтуюць скразны канферанс у вобразах літаратурных герояў. А. Бондар і К. Коцін валодаюць вялікім запалам і невычэрпнай энергіяй, творчыя магчымасці іх неабмежаваныя. І мы гаворым артыстам: добрай і шчаслівай вам дарогі, маладыя сябры!

Мікалай ЗОРЫН,
артыст Беларускай дзяржаўнай філармоніі.

Дзяржаўны рускі драматычны тэатр БССР імя М. Горкага паказаў мінчанам новую работу — спектакль па п'есе Г. Мдзівані «Дзень нараджэння Тэрэзы», прысвечаны жыццю і барацьбе гераічнага народа Кубы, які мужна адстойвае заваёвы рэвалюцыі. Пастаноўка спектакля ажыццёўлена галоўным рэжысёрам тэатра М. Сіваном, мастацкае афармленне — В. Галубовіча. Вядучыя ролі ў новым спектаклі выконваюць А. Кіпчава, І. Шаціла, Я. Карнаухаў, І. Ражба, Р. Янюўскі, Л. Весніна, З. Асмолава, Л. Былінская, В. Мароз, В. Краўчанка і інш.

На здымку: сцэна са спектакля.

Фота В. ЛУПЕЙКІ і І. ЗМІТРОВІЧА. БЕЛТА.

Нашы госці

ЦУДОЎНАЯ ПАРА

Выступленні ў Мінску вядомага скрыпача І. Мянухіна (ЗША) і яго сястры — піяністкі Х. Мянухінай выклікалі ў аматараў мастацтва велізарную цікавасць. 23 лістапада адбыўся санатны вечар выдатных амерыканскіх музыкантаў.

Гэта было надзвычайнае свята музыкі. У праграму вечара ўваходзілі тры жамчужыны камернай музыкі — санаты Брамса, Франка і геніяльная «Крэйцэрава саната» Бетховена. З першых жа гукаў у зале ўсталявалася атмасфера сапраўднай творчасці, вялікага ўсёперамožнага мастацтва. Цяжка што-небудзь вылучыць у бездакорным выканаўчым майстэрстве І. Мянухіна. Можна гаварыць пра яго незвычайны гук, пра чысціню і высакароднасць стылю, пра дасканалую тэхніку. І ўсё ж хочацца гаварыць не пра гэта. Бадай, галоўны сакрэт вялізнага поспеху гэтага вялікага мастака — ва ўменні раскрываць думкі і пачуцці ў музыцы так, што яны становяцца думкамі і пачуццямі слухачоў. І. Мянухін не проста іграе. Ён шкат ведае. І хочацца слухаць яго яшчэ і яшчэ. За кожным гукам адчуваецца вялікая праўда вялікага мастацтва

Шчыра кажучы, імя папулярнага скрыпача загадзя дазваляла чакаць цудаў. Але сапраўднай сенсацыяй вечара з'явілася «адкрыццё» раней невядомай нам піяністкі Х. Мянухінай. Гэта — не проста брат і сястра. Гэта — брат і сястра па творчым духу, артыстызму і майстэрству. Выдатная піяністка ніколькі не ўступала свайму праслаўленаму партнёру.

24 лістапада І. Мянухін з такім жа вялікім поспехам прыняў удзел у сімфанічным канцэрце. Ён выканаў разам з нашым аркестрам (дырыжор В. Катаеў) фартэпіянныя канцэрты Бетховена і Брамса.

А. ВАКСЕР.

Спявае Ванда Якубоўска

Аматары мастацтва сталіцы пазнаёміліся з творчасцю маладой польскай спявачкі, салісткі Познанскай оперы Ванды Якубоўскай. Праграма яе сольнага канцэрта, які адбыўся ў памяшканні клуба імя Дзяржынскага, вызначалася поўнай складанасцю і разнастайнасцю. У першым аддзяленні побач з папулярнымі ар'ямі і рамансамі рускіх і заходнееўрапейскіх кампазітараў выконваліся такія мала вядомыя творы, як арыя Зосі з оперы Манюшкі «Сплаў», песенька Катоф з оперы Ружыцкага «Казанова».

Лірычнае сапрано В. Якубоўскай гучыць цёпла і свабодна. Яе спяванню ўласцівыя надзвычайная музычнасць і тонкая фразіроўка. Гэтыя якасці творчай індывідуальнасці спявачкі дапамаглі ёй выканаць у другім аддзяленні канцэрта творы зусім процілеглага праграме першага аддзялення. Добрым мастацкім густам вызначаліся «Чардаш» Разалінды з аперэты І. Штрауса «Лятучая мыш», арыя Ганны з аперэты Легара «Вясёлая ўдава». Проста і наіўна прагучала прыемная песенька польскага кампазітара Наваевіцкага «Помніш, Янку».

Знайшлі сваё месца ў праграме канцэрта і творы савецкіх аўтараў — лірычная арыя Наташы з аперэты Мілюціна «Неспакойнае шчасце» і тэмпераментная песенька Пепіты з аперэты Дунаеўскага «Вольны вецер»

Поспеху Ванды Якубоўскай у значнай меры спрыяў яе партнёр — польскі піяніст Вацлаў Гай, які вельмі прафесіянальна і музычна выступіў у ансамблі са спявачкай.

Акрамя канцэрта ў Мінску В. Якубоўска выступіла таксама перад працоўнымі горада Баранавічы.

Ю. ВАСІЛЬЕЎ.

НАСУСТРАЧ СОНЦУ і ПАВЕТРУ

(Заканчэнне. Пачатак на 2-й стар.).

як гістарычны цэнтр. Тое, што захавалася тут ад вайны (будынак музычнай школы, касцёл, вежа гарадскога гедзінніка, Дом Прафсаюзаў, дом аблвыканкома) вымагала перш за ўсё беражліва паставіцца да гісторыі Мінска, захаваць нашчадкам не толькі «жывую» архітэктуру мінулых стагоддзяў, але і камяні, багата палітыя крывёю мінскага пралетарыяту ў гады рэвалюцыі і абароны яе заваёў.

Дык не ж! Цэлы месяц дзяўблі магутныя сцены гарадской вежы. Гэта было адразу пасля вайны. А праз пятнаццаць гадоў парашылі знявечыць і самую плошчу, прарэзаўшы ў ёй праезд на збудаваны праз Нямігу шляхапровад. І вось былы ўтульны скверык ператварыўся ў непрыветлівы «зялёны чуб», узбіраецца на які даводзіцца па няэручных, наспех прыладжаных прыступках. Тое ж сталася і з уваходамі ў музычную школу, у Дом фізкультуры таварыства «Спартак» — прыступкі занялі добрую палавіну тратуара. І дзеля чаго ўсё гэта нагароджана? Толькі не дзеля зручнасці людзей а перш за ўсё — для параднага выгляду Паркавай магістралі, якую, дарэчы, не так ужо і прыспеў час завяршаць. А тым больш не ўзнікла пільная патрэба ў шляхаправодзе. (Варта глянуць на чаргу аўтамашын, якія збіраюцца ля чыгуначных шлагбаумаў на выездах з горада і падлічыць, колькі там траціцца гаручага і марнуецца часу ў людзей).

Чытаючы апублікаваны нядаўна ў «Литературной газете» польскі дзённік Ю. Юзоўскага, нельга абмінуць увагай любоў нашых суседзяў да гісторыі сваёй дзяржавы, яскравым увасабленнем чаго з'яўляецца адбудова Варшавы, якая «чытаецца» сёння як мнагатомная гісторыя архітэктуры.

А прайдзіцеся па вуліцах Вільнюса. Вы вядома ж захопіцеся высокім майстэрствам літоўскіх горадабудаўнікоў, якія здолелі даўняе і сённяшняе спалучыць так стройна і прадумана, нібы перад табой разгорнута архітэктурная хрэстаматыя. Ідзеш і чытаеш жыццяпіс славутага ў стагоддзях горада.

А вось тым, хто праектуе і будуе Мінск, неяк ужо надта карціць павыдзіраць з «архітэктурнага падручніка» апошнія яго старонкі, прысвечаныя гісторыі, і на іх месца паставіць, як правіла, не заўсёды зграбныя «ўклейкі». Яскравы прыклад таго — упомненая вышэй рэканструкцыя плошчы Свабоды і не менш яскравы — перабудова плошчы імя Леніна.

Плошча гэтая склалася яшчэ да вайны, як курданер перад Домам урада. Пашырэнню яе замінаў жылы шасціпавярховы дом насупраць. Выношваўся праект перасоўкі яго на рог Універсітэцкай (тады Базарнай вуліцы), але здзейсніць гэтую задуму перашкодзіла вайна. Замінае гэты дом і цяпер і пытанне аб яго зносе не знята з парадку дня будаўнікоў. А варта было б зруйнаваць гэты дом, пабудаваць шматпавярховы будынак на месцы драўляных па Універсітэцкай вуліцы, якая цяпер ужо стала былой, і мы мелі б вельмі зграбную, утульную плошчу для парадаў і святочных урачыстасцей. Над такой плошчай панаваў бы непаўторны ансамбль Дома ўрада з помнікам Леніну перад ім — самым удалым пакуль у Мінску творам манументальнага мастацтва. А той квартал, што застаўся б паміж вуліцамі Свярдлова і Універсітэцкай уздоўж Савецкай не толькі сэканоміў бы сотні квадратных метраў жылля, але і паслужыў бы жывой старонкай архітэктуры дарэвалюцыйнага Мінска. Дарэчы па гэтым месцы рэканструяванай плошчы ніхто не ездзіць і не ходзіць.

Пагоня за маштабнасцю прывяла да таго, што плошча імя Леніна страціла сваё стройнае аблічча і набудзе яго невядома яшчэ калі.

Калі агалілася вялікая прастора (невядома дзеля чаго трэба было выбіраць памеры, большыя нават за Красную плошчу ў Маскве), дык Дом урада адразу паніжэў, нібы «асеў», і страціў сваю былую імпазантнасць. Ні ў якім разе нельга дапусціць зруйнавання чырвонага касцёла, бо ён «трымае» ніжэйшыя збудаванні справа і злева. Пакуль што іменна паўночна-заходні бок яе ў кірунку былой Савецкай вуліцы і выглядае найбольш у ансамблі, чаго не скажаш пра паўднёва-ўсходні яе бок, зусім нечытабельны. Ніяк нельга пагадзіцца з А. Тафам, які сцвярджае, што рэканструкцыяй плошчы імя Леніна беларускія архітэктары «стварылі ансамбль цэнтральнага раёна нашай сталіцы». Самаму звычайнаму недасведчанаму ў пытаннях архітэктуры, але не без добрага густу чалавеку відаць, што спатрэбяцца яшчэ вялікія намаганні і неапраўдана высокія выдаткі, каб ператварыць сённяшні хаос у нешта стройнае, суцэльнае, ансамблевае.

Калі ўжо гаварыць пра ансамблевасць плошчаў, дык у Мінску гэта будуць плошча Перамогі і плошча імя Якуба Коласа. Што датычыць апошняй, дык тут справу не давялі да канца, уварваўшыся ў агульны ансамбль неарганізаванай забудовай паўднёвага яе боку, дзе бянтэжаць вока і невыразная патуга на сучаснае вырашэнне будынка універмага (навошта класці цэгляў там, дзе павінна быць шкло), і старамодны будынак філармоніі. Але і пры гэтых агрэхах плошча імя Якуба Коласа самая ўдалая па спалучэнню эстэтычных і практычных мэт. Параднасць у ёй не выстаўляецца на першы план і добра спалучаецца з задачамі разгрузкі асноўных патокаў транспарту. Спадзяёмся, што помнік Якубу Коласу зробіць плошчу яшчэ выразнейшай. (Дарэчы ці не занадта шмат захапіліся ў горадзе ўстаноўкай камянёў пад будучыя помнікі? А калі ж будуць самі помнікі?).

Плошча Перамогі (яе стройнасць парушаюць «багата сервіраваныя» фасады дамоў, што прымыкаюць да плошчы збоку моста) магла б таксама служыць узорам удалага спалучэння хараства і мэтазгоднасці, калі б яна апынулася на месцы перакрыжавання праспекта з Даўгабродскай вуліцай, дзе знаходзіцца асноўны вузел гарадскога руху. (Дарэчы і манумент Перамогі вымагаў збудавання на нейкім пануючым месцы, а тым больш «вечны агонь»).

А што добрага скажаш пра Цэнтральную плошчу? Пакуль нічога. Няўдалай копіяй старажытнага парфенона выглядае будынак Палаца культуры прафсаюзаў. Аблеплены ва ўгоду мяшчанскаму густу статуэткамі для забавы гарадскога пітасна, ён не цешыць людское вока ні звонку, ні ўнутры. Ён застанецца сведкам дагматычнага мыслення тых архітэктараў, што дбалі толькі аб збудаванні сабе непахісных манументаў і не ведалі пачуцця меры.

Я не ведаю, на чым спынілася архітэктурная думка пры вырашэнні лёсу Цэнтральнай плошчы. Мне, напрыклад, хацелася б, каб у цэнтры яе ўзнёсся высока-высока манумент, які ўславіў бы гераічны навуковы і працоўны подзвіг савецкага народа — завяжальніка космасу, як увасабленне зместу новай эры чалавецтва. Яго варта вырашыць у простых формах, але смела па інжынернай думцы. Такі манумент адцягнуў бы ўвагу ад пачварнага Палаца прафсаюзаў. А ўздоўж Інтэрнацыянальнай вуліцы з алюмінію і шкла варта збудаваць галерэю для паказу сродкамі выяўленчага мастацтва і фатаграфіі знатных людзей рэспублікі, хто сваімі працоўнымі намаганнямі набліжае светлую будучыню камунізма. Не мёртвымі іканастасамі, як выглядаюць цяпер шматлікія Дошкі гонару, а рэпартажнымі «жывымі» здымкамі людзей за іх прафесіянальным заняткам павінна быць запоўнена такая галерэя. І тады безымянай пакуль Цэнтральнай плошчы можна будзе надаць гордае імя — плошчы Працы. Так і толькі так можна адзначыць подзвіг мільёнаў працаўнікоў Савецкай Беларусі, што ўзнялі гарады і вёскі з руін і попелу і мацуюць сёння яе індустрыяльную славу.

СЛУШНА заўважае С. Герус у артыкуле «Ідучы па вуліцах Мінска...», што «разумней было б разавіваць традыцыі архітэктара Ланбарда — аўтара нашага Дома ўрада і опернага тэатра, Дома афіцэраў і Акадэміі навук, традыцыі, у якіх збудаван будынак ЦК КПБ архітэктарамі Варакскіным і Воінавым». Толькі з гэтага пераліку варта выключыць оперны тэатр. Невыразны гэта будынак.

Мала дбаюць нашы архітэктары пра выразнасць сваіх збудаванняў. У Мінску няма ніводнага будынка тэатра, пра які можна было б беспамылкова сказаць, што гэта тэатр. Калі на рэканструяваным будынку Тэатра імя Я. Купалы яшчэ не было шыльдаў, многія прыезджыя пыталіся — гэта што, універмаг? А як парушылася ўтульнасць сквера каля тэатра? Стары будынак выглядаў так, нібы вырас за адно з тымі дрэвамі, што былі вакол. Як гэта, наогул, церпіць вока гарадскога архітэктара, каб побач з «лірычным» фантанам у цэнтры стаяла нязграбная камяніца з надпісам «Кветкі» і такая ж грувасткая, як уваход у купецкі асабняк, Дошка гонару! Дбаць пра выразнасць кожнага будынка, пра ансамблевасць кожнага кутка ў горадзе — гэта найпершая адзнака сталасці архітэктурнай думкі.

Мноства зеляніны — адна з характэрных адзнак пасляваеннага Мінска. Паркі, сады, скверы, бульвары, азеляненыя двары радуюць кожнага з нас, як крыніцы свежага паветра, як месцы, дзе чалавек вяртае сабе добры настрой. Неяк непрыкметна за якіх 10—15 гадоў выраслі цэлыя зялёныя кварталы, прыносячы нам халадок у спякотныя дні, зацішак у непагадзь, аздабляючы горад сваімі ўборамі, пашыраючы колерную гаму гарадскіх прастораў.

Захапленне халоднымі і брудным танамі ў афарбоўцы фасадаў нашых будынкаў трывае яшчэ і па сённяшні дзень, асабліва ў цэнтры горада. Як бы выйграла, скажам, вуліца Карла Маркса, з такой прыгожай перспектывай, калі б зазірнула сюды вока мастака і паспрабавала «высветліць» фасады, зняць з іх кляймо аднастайнасці і шэрасці. Дакуль жа дабаўка ў пабелку англійскай сажы ці бруднай охры будзе адзіным варыянтам асвяжэння фасадаў?! Паглядзіце, шаноўныя горадабудаўнікі, як нашы суседзі ў Літве, Латвіі ўмеюць самаму старадаўняму будынку надаць самы сучасны выгляд, карыстаючыся толькі багаццем вясёлкавага спектра.

А ў дадатак да фарбаў яны шырока скарыстоўваюць дэкаратыўнае мастацтва — мазаіку з прыроднага каменя на фасадах, вітражы з каляровага шкла. Нясмелыя крокі пачынаем рабіць і мы. Я маю на ўвазе вітражы ў прыбудове Палаца піянераў (аўтары — мастакі Р. Вашчанка і У. Стэльмашонак), якія заслугоўваюць ухвалы і далейшага пашырэння ў сучасных праектах грамадскіх ды і жылых будынкаў. Колькі тэм і матываў для дэкаравання будынкаў і цэлых кварталаў можна пачарпнуць у легендах беларускага народа, у творах літаратуры.

Кантрасты патрэбны і ў азеляненні горада. Без творчай фантазіі вядзецца яно пакуль у нас. Сляпое захапленне ліпавымі прысадамі не ажыўляе горад, а робіць аднастайнай яго колерную гаму: не паспеюць ліпы як след распусціцца, як жоўкнуць і ўжо ў ліпені наводзяць на людзей асенні сум. Непрактычныя і таполі, бо ў пару цвіцення яны засмечваюць горад пухам — не адчыніш нават акна. Чаму такая непашана да клёна? А ён жа прыгожы і ўвесну, і ўлетку, і асабліва ўвосень, калі штодзень мяняе свой убор. Чаму так мала ў горадзе пасадак бярозы (як ажыўляе яна, напрыклад, паркавую частку стадыёна «Дынама»), рабіны, акацыі, каштану, ніцай вярбы, лістаўніцы, ясеню, пад'ялоўцу, бэзу, шыпшыны, каліны — усяго таго, чым багаты лясы і паркі Беларусі? А як можна засланіць ад вока нязграбныя тарцы будынкаў пасадкамі раслін, што ўюцца — хмель, вінаград дзікі і інш. А газоны, калі для засеву ўжыць не толькі цімафееўку ці райграс, але ўсё багацце беларускіх лугоў, — могуць не толькі аздобіць горад, але і напаіць яго духмяным водарам.

Ці не пара здаць на пераплаўку чыгун і жалеза, якога так шчодра панастаўлялі ў гады архітэктурных лішнасцей? Ніхто не вымагае знімаць рашоткі там, дзе яны сапраўды патрэбны — на месце, на ўзбярэжных, вакол школьных двароў, прадпрыемстваў і г. д. Але навошта яны, скажам, каля бульвараў па вуліцы Леніна, Камсамольскай, каля паркаў і сквераў. Козы і свінні ў горадзе даўно не пасвяцца, а садок ля гарадскога радзільнага дома абносяць жалезабетонным тынам. Дзеля чаго штучна адгароджваць чалавека ад прыроды? Хіба «жывая» агароджа менш эстэтычная за аднастайна зробленыя чыгунныя адліўкі, пафарбаваныя чорным лакам і аздобленыя бронзай?

Даўно пара даваць рашучы адпор захапленню казённай манументальнасцю, сляпой прыхільнасці да грувасткіх, акасцянелых форм, пракланенню перад экзотыкай паўднёвай флоры. Побач з намі, на прасторах беларускай зямлі, у яе нетрах — невычэрпнае багацце матэрыялаў і сродкаў, смелае і ўмелае выкарыстанне якіх можа зрабіць нашы гарады непаўторнымі, самабытнымі, сучаснымі і вечна прыгожымі. А калі гэтыя незлічоныя багацці ды памножыць на невычэрпную ініцыятыву людзей — вынікі могуць быць самыя нечаканыя.

Прыгадваем, з якім энтузіязмам выходзілі мы ў першыя пасля вайны гады на руіны горада, каб сабраць кожную цаглінку, якая магла спатрэбіцца, каб прыбраць увесь друз і смецце, выходзілі ўсе — ад радавога рабочага да сакратара ЦК, і дзіву даешся — няўжо сёння паменшала любоў мінчан да свайго роднага горада. Не. Любоў засталася ранейшай, а супакаенне збудаваным ўзяло верх над ініцыятывай, самадзейнасцю мас.

А чаму б не арганізаваць справу так, каб ашчасліўлены нараджэннем дзіцяці бацька мог пасадзіць на скверы перад радзільным домам па Інтэрнацыянальнай вуліцы дрэва ці куст бэзу ды даглядаць іх аж пакуль сын ці дачка не пойдуць у школу. Глядзіш, і зашумеў бы сад «Малюткі». Ці вось на рагу вуліц Леніна і Кірава, на вялікай плошчы, што прымыкае да Палаца піянераў, кожны піянерскі атрад на семым пачатку свайго ўзнікнення мог пасадзіць па бярозцы і даглядаць іх да заканчэння восьмага класа. Глядзіш і загудзе бярозавы гай, а назвуць яго можна будзе паркам «Бярозка». Знойдзецца мусіць месца і для саду «Маладосць», стварэнне якога можа стаць клопатам тых, хто ўступае ў шлюб. Ды ці мала ёсць прычын, якія могуць стаць пачаткам добрай справы на карысць усяго горада. Хіба гэта не сучасна?!

ПРАЧЫТАЎШЫ гэты артыкул, некаторыя скажуць, што вось размахаўся чалавек кулакамі пасля таго, як бойка адшумела. Яно можа і праўда, калі кіравацца прыказкай — «Што з возу ўпала, тое прапала». Але ж не трэба забывацца, што будуецца не толькі Мінск, а і іншыя гарады — вялікія і малыя, — дзе яшчэ не позна задумацца над праблемай разумнага спалучэння гісторыі і сучаснасці, прыроды і збудаванняў. Што ж датычыць Мінска, дык, на вялікі жаль, атрымалася так, што тыя, хто праектуе і будуе яго, як кажуць, ад зямлі адарваліся і неба не дасталі. З пагардай паставіліся да гісторыі і прыродных умоў горада, выявілі абуральны кансерватызм у выпрацоўцы сучаснага архітэктурнага аблічча горада.

Будаваць па-сучаснаму гэта значыць адважыцца на пошукі простых, але яркіх форм, смелых інжынерных канструкцый, выкананых у сучасным матэрыяле (бетон, шкло, метал, пластыкі), дынамічных кантрастаў пры вырашэнні прасторавай кампазіцыі і сілуэтаў асобных будынкаў і цэлых раёнаў. Будаваць па-сучаснаму — гэта значыць дбаць перш за ўсё пра зручнасць для чалавека. Будаваць па-сучаснаму — значыць імкнуцца ўвысь — насустрач сонцу і паветру. А каб будаваць так, не пашкодзіць часам азірнуцца і на тое, што ўжо зроблена, — прарэцэнзаваць гатовыя збудаванні ў друку так, як рэцэнзуюцца новыя кнігі, спектаклі, фільмы, творы выяўленчага мастацтва. Патрэбна, ой, як патрэбна пастаянная творчая садружнасць архітэктараў і мастакоў, архітэктараў і пісьменнікаў, архітэктараў і вучоных — эканамістаў, прыродазнаўцаў, гісторыкаў.

Уладзімір ЮРЭВІЧ,
пісьменнік.

ЧАРГОВЫ НУМАР ЧАСОПІСА «НЕМАН»

У нумары шостым (лістапад — снежань) часопіс друкуе творы, прысвечаныя 80-годдзю Якуба Коласа, — урыўкі з кнігі М. Лужаніна «Паэт расказвае аб сабе» (пераклад Н. Кісліка) і верш М. Хведаровіча «Паэт» (пераклад І. Васілеўскага).

Змешчаны новыя апавяданні Б. Паўлёнка, Д. Уксусава, Г. Папова. Творчасць пачынаючых празаікаў прадстаўлена апавяданнямі «Першае мора» А. Браілоўскага, «Перамога» І. Панчанкі, «Маўчун» А. Савелічава, «Язмін» П. Тормасава, «Дах» П. Шкуты. Часопіс надрукаваў пераклады «Кароткіх апавяданняў» А. Пальчэўскага і апавяданне «Дзе ты, Леначка?» А. Кулакоўскага.

З паэтычных твораў змешчаны вершы М. Машары (пераклад І. Бурсава), Ю. Лакербая, В. Костылева, І. Катлярова, В. Макукіна.

У раздзеле «Нарысы» — «Колька Іванавіч» В. Панамарова.

Артыкулам В. Бурносава і Н. Ватацы адзначана саракагоддзе часопіса «Полымя».

Раздзел бібліяграфіі складаюць рэцэнзіі на кнігі «Голас сэрца» — зборнік вершаў беларускіх паэтаў, «Думкі салдацкія» В. Матрошына, «Я іду» І. Шклярэўскага, «Перакладаю вершы таварыша» Я. Хялемскага.

Пад рубрыкай «Сатыра і гумар» — апавяданні П. Кавалёва, вершы А. Лазнявога, байкі М. Макаева.

Часопіс багата ілюстраваны малюнкамі і фотаздымкамі.

Выйшлі з друку

У Дзяржаўным выдавецтве Беларусі выйшлі з друку і паступілі ў продаж наступныя кнігі:

Павел Кавалёў. Сонца ў вокны. Аповесць і апавяданні. Мастак М. Бельскі. Тыраж 7.500 экз., стар. 476. Цана 64 кап.

Сцяпан Ліхадзіеўскі. Берасцянка жывых трывог. Выбраныя вершы і пераклады. Мастак Л. Чурко. Тыраж 1.500 экз., стар. 168. Цана 19 кап.

Э. Чэчка, Б. Стральцоў. Дружная рунь. Нарысы. Мастак С. Русак. Тыраж 4 тыс. экз., стар. 112. Цана 11 кап.

Уладзімір Ляўданскі. На беразе ракі. Апавяданні. Для сярэдняга ўзросту. Мастак В. Ціхановіч. Тыраж 7 тыс. экз., стар. 132. Цана 29 кап.

Эдуард Валасевіч. Соль. Гумар і сатыра. Мастак В. Ціхановіч. Тыраж 4.500 экз., стар. 104. Цана 16 кап.

Рыгор Пукст. Пяць танцаў. Для фартэпіяна. З оперы «Марынка». Мастак А. Лісічнікаў. Тыраж 2 тыс. экз., стар. 20. Цана 28 кап.

Беларускія народныя песні. Апрацоўка А. Туранкова. Мастак М. Шырокаў. Тыраж 800 экз., стар. 40. Цана 35 кап.

Пачынаючаму баяністу. Зборнік п'ес для вучняў музычных школ. Апрацоўка В. Савіцкага. Вокладка Л. Чурко. Тыраж 4 тысяч экз., стар. 28. Цана 33 кап.

Фільмы пра мастацтва

Фільмафонд рэспублікі папоўніўся новымі хранікальна-дакументальнымі і навукова-папулярнымі кінафільмамі па мастацтву.

З глыбіні далёкіх стагоддзяў дайшлі да нас сказы пра подзвігі волата Макаса, яго сына Семетэя і ўнука Сейтэка. Кіргізкі эпас «Манас» — адзін з геніяльных народных твораў сусветнага мастацтва. Стагадоваму юбілею першага выдання «Манаса» і прысвечана новая каляровая кінакарціна «Вялікі эпас», створаная рэжысёрам Л.